Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
4 ВЕРАСНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 172 (29286)



ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ ДЫЯЛОГА З МОЛАДДЗЮ МС

ПЕРАТВАРЭННЕ ДЗІВІНА МС



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір КУХАРАЎ, старшыня Мінгарвыканкама:**

*«Мінск павінен ва ўсіх адносінах адпавядаць статусу сталіцы, гэта горад разнапланавы і тут шмат кірункаў дзейнасці. Таму неабходна працаваць комплексна для таго, каб горад развіваўся сістэмна, для забеспячэння камфортнага пражывання ў ім грамадзян. Галоўная задача — каб жыхарам жылося камфортна, людзі атрымлівалі ўсе неабходныя віды паслуг, каб горад не спыняўся ў сваім развіцці. Мінск павінен заставаца месцам прыцягнення шматлікіх турыстаў».*

# У сваёй стыхіі





25-гадовы жыхар вёскі Азярніца Дзмітрый БЯРОЗКА працуе механізатарам у аграрным сектары Лунінецкага раёна, а менавіта — на сельгаспрадпрыемстве «Гарадоцкі». У гаспадарцы пачалася нарыхтоўка кармоў з кукурузы. Кормаўборачны атрад, у якім задзейнічаны і Дзмітрый, павінен скасіць «царыцу палёў», як называлі раней гэтую культуру, на плошчы 850 гектараў. Кожны дзень механізатар шчыруе, каб не было прастояў, каб своечасова напаўняліся кузавы трактароў, «мазаў» і «камазаў» сіласнай масай.

— Яшчэ да арміі я папрацаваў механізатарам, — паспрабаваў: які ён — хлеб трактарыста, — кажа Дзмітрый падчас невялікай паўзы. — Дэмабілізаваўся — і мяне зноў пацягнула на палескія прасторы і палеткі, у родную стыхію.

Пакуль спрыяе надвор'е і не падводзіць тэхніка, Дзмітрый Бярозка на сваім «Палессі» кожны дзень змяльчае па 500—600 тон спелай і сакавітай кукурузы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• **Першую электраэнергію на БелАЭС плануецца выпрацаваць да лістапада.**



• Каля траціны рабочых месцаў у Беларусі так ці інакш завязаныя на рынак ЕАЭС.

• **У Нацыянальным аэрапорце Мінск пачалі праводзіць тэсціраванне на COVID-19.**

• БДУ адзіная з ВНУ Беларусі ўваходзіць у рэйтынг Times Higher Education.

• **У Мар'інай Горцы створаны магутнасці па выпуску прадуктаў харчавання для хворых на фенілкетанурыю.**

ISSN 1990 - 763X

Час чытаць

# У ВЫХАДНЫЯ, БЫВАЕ, ЧАРГА СТАІЦЬ

### З развіццём гаджэтаў сельскія бібліятэкі не страчваюць чытачоў, а павялічваюць іх колькасць. Насуперак прагнозам

**Бываючы ў камандзіроўках у сельскай мясцовасці, стараюся зазірнуць у бібліятэку. Да гэтага некалі прывучыла адданая чытачка газеты з Ганцавіцкага раёна Ірына Міхайлаўна Рудкоўская, сястра знакамітага паэта. Яе, на жаль, ужо няма з намі, але шчырыя размовы пра кнігу помняцца. Ірына Міхайлаўна казала, што ў бібліятэцы жыве грамадская думка, тут збіраюцца людзі. Заўсёды шкадавала, што ў невялікіх вёсках гэтыя ўстановы культуры закрываюцца; бедавала, што моладзь з-за камп'ютараў менш увагі ўдзяляе кнізе.**

## БАГАТАЯ ЧЫТАЧАМІ

Сапраўды, быў пэўны час, калі некаторыя бібліятэкі адчувалі адток чытачоў. А цяпер многія адзначаюць адваротную тэндэнцыю. **Наталля ПАЎЛЮКОВІЧ, бібліятэкар з Лінова Пружанскага раёна,** расказала забаўную гісторыю пра тое, як прыходзіла развітвацца адна пастаянная чытачка. Жанчына выйшла на пенсію і раптам прынесла ўсе кнігі, што былі на руках.

СТАР. 15

Вакол жылля

# ПАЎЗА, ЯКАЯ ЗАЦЯГНУЛАСЯ

### Чакаецца падзенне цэн на кватэры

**Дырэктар агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровы старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ расказаў пра тое, што адбываецца на рынку нерухомасці.**

## Якія варыянты?

Паводле яго слоў, недзе з сярэдзіны жніўня адбылося значнае зніжэнне цікавасці людзей да куплі і продажу кватэр, у разы зменшыліся прагляды жылля — усё гэта прывяло да значнага падзення аб'ёмаў здзелак у агенцтвах нерухомасці. Эксперт адзначае, што нават чаканні, што ў канцы жніўня рынак ажывіцца за кошт студэнтаў, якім неабходна жыллё, не апраўдаліся. Актыўнасць, калі параўноўваць з двухтыднёвай даўнасцю, вядома, узрасла, але не ў такіх аб'ёмах, як у мінулыя гады.

**Аналітык рынку нерухомасці Дзмітрый РЫТВІНСКІ** кажа, што ў бліжэйшай перспектыве рынак сутыкнецца з вялікай верагоднасцю зніжэння цэн на нерухомасць, а зніжэнне актыўнасці на рынку яшчэ больш павялічыцца. Людзі адкладаюць пакупкі, пры магчымасці — прыняцце рашэнняў аб прыцягненні крэдытаў, пераглядаюць сямейныя бюджэты, скарачаюць выдаткі, здымаюць дэпазіты, шукаюць альтэрнатыўныя варыянты куплі нерухомасці.

Актыўнасць на рынку ў чэрвені—жніўні ў параўнанні з зімова-вясновым перыядам была ў асноўным звязаная з магчымасцю ўзяць адносна «танны» крэдыт у беларускіх рублях на куплю або будаўніцтва. А што цяпер?

СТАР. 15

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!
Пачалася падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «Мы поўныя рашучасці адстаяць свой суверэнітэт і незалежнасць»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са старшынёй Урада Расіі Міхаілам Мішусціным. Аб гэтым паведамляе прэс-служба лідара дзяржавы.**

Кіраўнік краіны падзякаваў суразмоўцу за інтэнсіўныя перагаворы паміж урадамі, якія ідуць апошнія тыдні. «Я ўсё часцей кажу, у нас гэта проста відаць, адчуваецца ўсё ў сувязі з асобнымі выпадамі так званай нашай апазіцыі (не ведаю, як яе назваць, я яшчэ не зусім разумею, як назваць усё гэта). Але, тым не менш, гэта для нас урок», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што гэты ўрок павінен падштурхнуць дзве братэрскія краіны да адпаведных высноў. «І па многіх пытаннях, па якіх мы быццам бы не змаглі раней дамовіцца, каб мы дамовіліся. І вы з прэм'ерам Беларусі правялі вялікую работу, каб зблізіць нашы пазіцыі і па многіх пытаннях, наогул дамовіцца», — канстатаваў беларускі лідар.

Паводле яго слоў, з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным ёсць дамоўленасць, што пасля ў Маскве пройдзе сустрэча ўжо на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў.

«Я заўважыў, назіраючы за расійскімі падзеямі, у іх — Захаду — новая фішка з'явілася. Зноў «навічок», зноў атручэнне. Дык я вам павінен сказаць, што ўчора або пазаўчора, я дакладна не помню, да выступлення Меркель (яна заявіла, што яму — Навальнаму — хацелі закрыць рот) мы перахапілі размову. Мы так разумеем, Варшава размаўляе з Берлінам. Два абаненты на сувязі. Перахапіла наша радыёэлектронная ваенная разведка. Паколькі там (на заходніх рубяжах Беларусі. — **«Зв.»**) разгорнуты часці, і мы, вядома, вядзём і ў радыёсферы процiборства з натаўцамі. І мы перахапілі цікавую размову, якая (я вам дам пачытаць яе, мы падрыхтуем і накіруем у ФСБ) выразна сведчыць аб тым, што гэта фальсіфікацыя. Ніякага атручэння Навальнага не было», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён выказаў меркаванне, што група спецыялістаў падрыхтавала для канцлера Германіі Ангелы Меркель факты, можа, і заяву, якую яна зрабіла. «Зрабілі яны гэта — цытата: «Каб адбіць ахвоту Пуціну сунуць нос у справы Беларусі». Я працытаваў гэту размову», — перадае словы Прэзідэнта яго прэс-служба.

Як ён паведаміў, поўнасцю ўсе матэрыялы хутка будуць у расійскіх спецслужбаў для таго, каб яны разабраліся, каму гэта трэба. «Яны ведаюць, што ў Расіі выбары, і трэба перад гэтымі выбарамі нейкую падсунуць гадасць. Мы думаем, што яшчэ нешта прыдумаюць. Вось іх стыль. Вось іх твар», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Аляксандр Лукашэнка зрабіў выснову, што «спакойнага жыцця нам не будзе». «У гэтым я ўпэўнены. Але вы павінны разумець, што мы поўныя рашучасці адстаяць свой суверэнітэт і незалежнасць і не дазволім тут нас нахіляць. Мы бачым, адкуль ужо ногі растуць. І не проста ногі. Мы бачым, што яны па вушы ўжо загразлі ў гэтай хлусні і мане. Але праўда заўсёды перамагала. І, напэўна, Гасподзь усё ж такі на нашым баку», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

# «Усё рабіць для народа і не забываць пра тое, што мы менавіта адтуль — ад зямлі»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка разгледзеў кадравыя пытанні — перадае прэс-служба кіраўніка краіны. Вячаслаў Расалай стаў намеснікам старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта. Валерый Вакульчык назначаны Дзяржаўным сакратаром Савета бяспекі, яго былую пасаду старшыні Камітэта дзяржаўнай бяспекі заняў Іван Тэртэль. Васіль Герасімаў будзе выконваць абавязкі старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю. Сталіца атрымала новага кіраўніка ў асобе Уладзіміра Кухарава, былы мэр Анатоль Сівак зойме вызваленую пасаду намесніка прэм'ер-міністра.**



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка пры прызначэнні Валерыя Вакульчыка, які працаваў на пасадзе кіраўніка КДБ амаль восем гадоў, адзначыў, што ніхто да яго нават палову такога тэрміну не змог вытрымаць.

«Вельмі надзейны, адданы дзяржаве і народу чалавек, старанны, прыстойны. Я ніколі не бачыў за гэтыя гады, каб ён лінію дзесьці скрывіў і ва ўгоду чагосьці зрабіў, — сказаў Прэзідэнт. — У нас была жорсткая дамоўленасць: мы, усе, хто сядзіць тут, з простых сем'яў, таму ні ў якім выпадку не павінны пакрыўдзіць людзей і не быць над народам. Мы павінны ўсё рабіць для народа і не забываць пра тое, што мы менавіта адтуль — ад зямлі».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў гэты перыяд сілавым структурам трэба забяспечыць не толькі пераемнасць, але і калектыўную работу спецслужбаў. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што апарат Савета бяспекі невялікі, кампактны, але яго трэба зазямліць. Былы кіраўнік ведамства Андрэй Раўкоў, на думку Прэзідэнта, не зусім утульна адчуваў сабе на гэтым месцы, і яму дадуць іншую вакансію для таго, каб ён працаваў і прыносіў карысць краіне.

«Што датычыцца Камітэта дзяржаўнага кантролю, вядома, не вельмі б хацелася дзёргаць Івана Станіслававіча (Тэртэля. — **«Зв.»**) з гэтай пасады. Тым больш ён пачаў годна гэтую работу, і гэта нават людзі адзначылі, не толькі я, — перадае словы кіраўніка дзяржавы яго прэс-служба. — Ён заўсёды адзначаў, што Герасімаў — здольны кіраўнік, памочнікам быў, ведае і народную гаспадарку, і іншае, працаваць ён можа. Напэўна, гэта так, але прыйдзецца пацыху даказваць яшчэ, што Камітэт дзяржкантролю ў моцных руках».

Кіраўніцтву КДБ і КДК прыйдзецца працаваць разам па некаторых кірунках, асабліва па пытаннях барацьбы з карупцыяй, фінансавымі правапарушэннямі і злачынствамі. Больш за тое, Камітэту дзяржкантролю трэба ўзяць на сябе некаторыя функцыі і паўнамоцтвы КДБ.

Прызначаючы Анатоля Сівака, які ўзначальваў Мінгарвыканкам, на пасаду віцэ-прэм'ера, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Думаю, што вопыт Сівака вельмі спатрэбіцца ва ўрадзе. Тым больш кіраўніцтва ўрада ў нас — усе зусім маладыя людзі. Таму твой вопыт там вельмі спатрэбіцца». Уладзіміру Кухараву Прэзідэнт нагадаў, што «Мінск — сталіца, тут трэба бегаць і круціцца-круціцца».

Аляксандр Лукашэнка рэзюмаваў: «Надышоў час правесці гэтую ратацыю. Я ўпэўнены, што і ўрад атрымае вопытнага чалавека, які ведае гэтую сферу. І горад Мінск атрымае актыўнага, дзейнага чалавека ў выглядзе былога віцэ-прэм'ера».

Адбылася ратацыя і ў мясцовай уладзе. Андрэй Бараноўскі ўзгоднены намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама, Сяргей Даўгалёў старшынёй Кастрычніцкага райвыканкама, Сяргей Ермаліцкі старшынёй Гомельскага райвыканкама, Дзмітрый Козел старшынёй Добрушскага райвыканкама, Аляксандр Грыгарэнка старшынёй Жлобінскага райвыканкама, Уладзімір Козыр членам Мінскага аблвыканкама і Мінскага гарвыканкама.

Узгадняючы прызначэнні новых кіраўнікоў мясцовых выканаўчых органаў у Гомельскай вобласці, кіраўнік дзяржавы заявіў, што не лічыць сітуацыю ў краіне праблемнай або складанай.

«Сказаць, што мы ў нейкі складаны перыяд праводзім гэтыя прызначэнні, не скажаш. Я ўсё спрабую асэнсаваць становішча ў краіне і ўвесь час прыходжу да высновы: калі выязджаеш за кальцавую дарогу, жыццё змяняецца ашаламляльна. Таму казаць пра тое, што ў нас вялікія праблемы і складанасці, было б проста смешна. У вас жыццё зусім іншае, чым у Мінску, і то ў Мінску яно адрозніваецца ад вашага толькі ў нядзелю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што сённяшнія прызначэнцы прыехалі ў сталіцу і, напэўна, не заўважылі тут ні «каляровых» рэвалюцый, ні катастроф, ні іншых жудасных рэчаў. «Ёсць пэўныя людзі, якім ужо публічна, дэманстратыўна не падабаецца тое, што адбываецца ў краіне. Яны былі і ў мінулыя выбары, але асаблівасць складаецца ў тым, што тады яны мірна ўспрымалі сваё паражэнне», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, на абстаноўку ў Беларусі ў большай меры ўплывае знешняе ўмяшанне. «Яно паходзіць з Польшчы, Чэхіі, Літвы і Украіны, што нас больш за ўсё насцярожвае. Вы ўчора чулі заяву міністра замежных спраў Расіі Лаўрова, які ўжо ў адкрытую (ён увогуле чалавек вельмі стрыманы ў гэтых адносінах, асцярожны) заявіў, што адбываецца на мяжы», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт упэўнены, што моладзь «заўсёды была актыўнай, любіць пахадзіць, пабузіць», але заклікаў іх да таго, каб не парушалі закон. Асабліва звярнуўся да студэнтаў. «Ну чаго не хапае студэнтам? Мы захоўвалі колькасць бюджэтнікаў, як было ў савецкія часы, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мы далі адтэрміноўку ад войска — калі ласка, вучыцеся. Не хочаш вучыцца — ідзі ў армію, уладкоўвайся на працу, калі адслужыў».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўсе органы ўлады зараз павінны спакойна працаваць і займацца сваімі задачамі: расціць хлеб, карміць народ.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Долару прадраклі падзенне на трэць



Долар можа ўпасці на 36 працэнтаў у адносінах да еўра ўжо на працягу наступнага года. Такі прагноз даў галоўны інвестыцыйны дырэктар кампаніі па кіраванні валютнымі рызыкамі AG Bisset Ульф Ліндал, паведамляе Reuters. Амерыканская валюта абвалілася прыкладна на 11 % ад свайго піку ў 2020 годзе ў параўнанні з кошыкам асноўных валют. Стаўкі хедж-фондаў супраць долара дасягнулі самага высокага ўзроўню за дзесяць гадоў, больш за трэць фондаў заявілі, што ў бягучым паўгоддзі найбольшай папулярнасцю сярод іх кліентаў карыстаўся шорт (стаўка на паніжэнне) на долар. У студзені курс долара складаў 1,12 за адзін еўра, у верасні — ужо 1,18. У апошнія тыдні падзенне прыпынілася, гэта «добрая магчымасць выскачыць з долара», растлумачыў Ліндал. Аналітыкі Goldman Sachs прагназуюць, што да 2023 года за адзін еўра будуць даваць ужо 1,3 долара. У TD Securities заявілі, што долар пераацэнены прыкладна на дзесяць працэнтаў у адносінах да іншых асноўных валют.

### На перазапуск эканомікі Францыі выдзеляць 100 млрд еўра

Прэм'ер-міністр Францыі Жан Кастэкс прадставіць ураду план па перазапуску эканомікі краіны пасля пандэміі, паведаміла Le Figaro. Кастэкс вылучыў тры прыярытэтныя задачы, на якія будуць накіраваны сродкі. Каля трэці фінансавання (30 млрд еўра) пойдзе на «азеляненне» эканомікі, яшчэ 35 млрд еўра — на павышэнне канкурэнтаздольнасці Францыі. Астатнія сродкі (35 млрд еўра) плануецца накіраваць на сацыяльныя і інфраструктурныя праекты. Па словах Кастэкса, прыярытэтам з'яўляецца стварэнне рабочых месцаў для моладзі. Прэм'ер-міністр адзначыў, што аб'ём прапанаванага плана амаль у чатыры разы больш за аб'ём падтрымкі эканомікі ў 2008 годзе. Кастэкс разлічвае, што ён дазволіць эканоміцы краіны вярнуцца да дакрызіснага ўзроўню ў 2022 годзе.



### Больш за 180 чалавек памерла з-за спёкі ў Токіа ў жніўні



У жніўні ў японскай сталіцы ад цеплавога ўдару памерлі 187 чалавек, з іх 178 памерлі, знаходзячыся ў памяшканнях. Пра гэта паведаміла японская тэлерадыёкампанія NHK. Спякотнае надвор'е звычайна ўсталёўваецца ў Японіі ў сярэдзіне ліпеня пасля завяршэння сезону дажджоў. Аднак сёлета ўвесь ліпень быў пахмурны, а на краіну абрынуліся рэкордныя па інтэнсіўнасці ападкі, якія прывялі да сходу апоўзняў і разліву рэк. У жніўні ў некаторых раёнах Японіі паветра прагравалася да 41,1 градуса, што стала паўторам гістарычнага тэмпературнага рэкорду двухгадовай даўнасці. Па інфармацыі Метэаралагічнага ўпраўлення краіны, гарачае надвор'е захаваецца і ў верасні. Насельніцтву рэкамендуецца прымаць меры засцярогі ад цеплавога ўдару. Летась у Японіі ад спёкі загінулі 126 чалавек, больш за 70 тысяч пацярпела.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
4 верасня 2020 г. № 33 (569)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

АКТУАЛЬНА

# ПРАБЛЕМЫ ТРЭБА АБМЯРКОЎВАЦЬ

## Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з актывам Маладзёжнага парламента

**Моладзь як адзін з рухавікоў працэсаў, што адбываюцца зараз у грамадстве — як ніколі патрабуе ўвагі. Увагі да яе штодзённых праблем, слушных прапаноў і карысных ініцыятыў. Пляцоўкай для абмеркавання ўсяго таго, што турбуе сёння беларускую моладзь, можа стаць Маладзёжны парламент (савет), які быў створаны пры Нацыянальным сходзе два месяцы таму. За гэты час ужо паспела рэалізавацца адна з ідэй, агучаных на той пляцоўцы, — з'явілася маладзёжная платформа «Рух наперад!», дзе маладыя людзі акумулююць свае прапановы. Якія? Аб гэтым ішла гаворка на сустрэчы актыву Маладзёжнай палаты са спікерам верхняй палаты беларускага парламента Наталляй КАЧАНАВАЙ.**
**У размове таксама прыняў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**


Фота БелТА.

Адно з пытанняў, якое аказалася ў цэнтры ўвагі, — разгляд прапаноў па рэфармаванні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.

— Мы запрасілі вас для абмеркавання актуальных пытанняў, якія хвалююць сёння вас — Маладзёжны парламент. Хочацца пачуць, якія ў вас планы на будучае, якія перспектывы, — распачала сустрэчу спікер верхняй палаты парламента. — У сваю чаргу, мы падзелімся інфармацыяй, каб наладзіць сумесную работу Савета Рэспублікі і Маладзёжнага парламента.

Яна запрасіла прысутных агучваць прапановы, пажаданні, меркаванні аб тым, якім чынам варта пабудаваць далейшае супрацоўніцтва.

У сустрэчы ўдзельнічалі прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі: навучэнцкая, студэнцкая і працоўная моладзь, тыя, хто мае неабыякавую грамадзянскую пазіцыю.

Як падзяліўся **Ягор МАКАРЭВІЧ, старшыня Маладзёжнага парламента (савета) пры Нацыянальным сходзе,** створаная структура можа і павінна стаць той дыскусійнай пляцоўкай, якая дазволіць весці дыялог у тым ліку з моладдзю, якая сёння ўдзельнічае ў несанкцыянаваных вулічных мерапрыемствах:

— Мы гатовыя чуць беларускую моладзь, нашых аднагодкаў, якія хочуць перамен, але самае галоўнае — усе перамены, якія могуць абдывацца ў любой дзяржаве, павінны быць арганізаваныя выключна ў межах закона, — падкрэсліў ён у размове з журналістамі. — Мы гатовыя да дыялогу з усімі.

Ягор Макарэвіч звярнуў увагу, што Маладзёжны парламент адкрыты для прапаноў, якія ў далейшым могуць быць пакладзены ў аснову рэалізацыі рэспубліканскіх праектаў.

Трэба сказаць, што за той невялікі час, які дзейнічае Маладзёжны парламент, быў запушчаны рэспубліканскі праект «Маладзёжная платформа «Рух наперад!». Па словах суразмоўніка, праект накіраваны на збор прапаноў па розных тэмах, якія датычацца развіцця беларускага грамадства.

— То-бок, калі ў маладога чалавека сёння ёсць ідэя, прапанова, ён бачыць Беларусь у доўгатэрміновай перспектыве, ён можа скарыстацца нашай пляцоўкай, для таго каб выказаць гэтае меркаванне, — патлумачыў сутнасць ініцыятывы старшыня Маладзёжнага парламента.

Ён адзначыў, што на сённяшні дзень моладзь ужо агучыла каля 200 прапаноў, яны закранаюць розныя сферы жыцця.

— Мы іх апрацуем і ў бліжэйшы час сустрэнемся з моладдзю ва ўсіх абласцях і сталіцы (не толькі з актывам, але і з моладдзю, якая мае альтэрнатыўны пункт гледжання на працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве). Такія дыскусійныя сустрэчы адбудуцца ва ўсіх абласцях і Мінску, — патлумачыў Ягор Макарэвіч.

Ініцыятарам сустрэч выступіць Маладзёжны парламент. Па словах яго кіраўніка, сярод прапаноў агучваюцца пытанні канстытуцыйнай рэформы, карэкціроўкі заканадаўства, стварэння дадатковых умоў для моладзі — тыя тэмы, якія рэальна яе хвалююць. Як падкрэсліў парламентарый, ён і яго калегі хочуць паказаць, што беларуская моладзь разумее і асэнсоўвае, якія перамены патрэбныя Беларусі. У першую чаргу — адкрыты дыялог з абмеркаваннем праблем і прапаноў па іх вырашэнні.

На думку **Уладзіслава ВОЛЧАКА, старшыні Пастаяннай камісіі Маладзёжнага парламента па ахове здароўя, спорце і турызме,** для моладзі актуальнымі з'яўляюцца тэмы размеркавання студэнтаў на першае працоўнае месца, заработнай платы, разгляду скаргаў пацыентаў на дзейнасць урача і іншыя, якія датычацца вострых пытанняў сістэмы аховы здароўя ў часткі моладзевай палітыкі.

Гаворачы аб сітуацыі ў краіне, старшыня профільнай камісіі падкрэсліў, што адкрыты дыялог і зносіны без бар'ераў дапамогуць зняць з парадку дня ўсе вострыя праблемы.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

У ТЭМУ

## Калі ініцыятыва вітаецца

### Неабходна кансалідаваць усе сілы, каб згуртаваць вакол сябе маладое пакаленне

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ сустрэўся са старшынямі гродзенскіх першасных арганізацый грамадскага аб'яднання БРСМ, паведамілі «МС» у профільнай камісіі.**


sovrep.gov.by

Абмяркоўваючы сітуацыю, якая зараз склалася ў маладзёжным асяроддзі, парламентарый адзначыў: «На жаль, часта мы бяздзейнічаем. Трэба не баяцца праяўляць грамадзянскую пазіцыю, адстойваць свой пункт гледжання. Трэба даведацца аб спадзяваннях маладых людзей, знайсці тое, што аб'яднала б іх спачатку ў працоўных калектывах, потым — у горадзе, рэгіёне і ў канчатковым выніку — у краіне. У БРСМ для гэтага ёсць усе рычагі. Калі паказаць, у чым сіла арганізацыі, шмат моладзі павернуцца да нас. Вазьміце ініцыятыву ў свае рукі і павядзіце за сабой моладзь Гродна».

Віктар Лісковіч упэўнены, што цяперашнім пераемнікам камсамола неабходна кансалідаваць усе сілы, каб згуртаваць вакол сябе маладое пакаленне.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Для развіцця міжрэгіянальных сувязяў

**VII Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі пройдзе 28—29 верасня ў Мінску і Мінскай вобласці.**

Аб гэтым паведамляе БелТА са спасылкай на прэс-службу МЗС Беларусі па выніках сустрэчы міністра гэтага ведамства Уладзіміра МАКЕЯ са сваім расійскім калегам Сяргеем ЛАЎРОВЫМ, якая адбылася ў Маскве.

Міністры замежных спраў дзвюх краін разгледзелі шырокае кола пытанняў беларуска-расійскіх адносін, узаемадзеяння ў межах Саюзнай дзяржавы, ЕАЭС, СНД і АДКБ, а таксама супрацоўніцтва на міжнароднай арэне, у тым ліку на пляцоўках ААН і АБСЕ.

Бакі выказалі намер працягнуць сумесную работу, накіраваную на паэтапнае зняцце абмежаванняў па руху грамадзян праз беларуска-расійскую мяжу і ўзнаўленне транспартных зносін.

«У кантэксце правядзення VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, запланаванага на 28—29 верасня 2020 года ў Мінску і Мінскай вобласці, бакі падрабязна спыніліся на міжрэгіянальных сувязях, якія з'яўляюцца значным складнікам расійска-беларускіх адносін і садзейнічаюць раскрыццю патэнцыялу гандлёва-эканамічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва дзвюх краін», — гаворыцца ў паведамленні.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

## Дарогі, сувязь і будоўля

**Віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА правёў выязны прыём грамадзян і прамую лінію ў Клічаўскім раёне, што на Магілёўшчыне.**


sovrep.gov.by

— Званкі паступалі з розных рэгіёнаў краіны. Звароты датычыліся жыллёвых праблем, удасканалення аўтадарог, добраўпарадкавання населеных пунктаў, якасці мабільнай сувязі, — расказаў парламентарый.

Так, жыхара вёскі Буднева Клічаўскага раёна непакоіў стан пад'язной дарогі да прыпыначнага пункта Альхоўка. Гэтая праблема вядомая мясцовым органам улады, і яны шукаюць шляхі вырашэння. Жанчына, якая жыве ў вёсцы Усакіна, паведаміла аб нізкай якасці мабільнай сувязі ў гэтай мясцовасці.

На асабісты прыём да віцэ-спікера Савета Рэспублікі прыйшла жыхарка Клічава, якую турбуе будаўніцтва шматкватэрнага дома паміж вуліцамі Бабруйская і Сацыялістычная. Яна ўпэўнена, што такое будаўніцтва істотна паменшыць дваровую тэрыторыю, а таксама дзіцячую пляцоўку і паркоўку для аўтамабіляў.

Анатоль Ісачанка паабяцаў звярнуць на гэтае пытанне асаблівую ўвагу — накіраваць адпаведныя службы для праверкі адпаведнасці будаўніцтва гэтага аб'екта ўсім неабходным патрабаванням.

Асобныя пытанні, з якімі звярталіся грамадзяне, былі аператыўна вырашаныя, а тыя, што патрабуюць дадатковага вывучэння, узятыя на кантроль.

ЗАЯВА

# Паважаць выбар народа

**Савет Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі выступіў з заявай па выніках правядзення выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 9 жніўня 2020 года. Яе тэкст размешчаны на афіцыйным сайце Дзяржаўнай Думы Расійскай Федэрацыі duma.gov.ru.**

«Выбары былі праведзеныя ў адпаведнасці з Канстытуцыяй і Выбарчым кодэксам Беларусі. Яны былі адкрытыя, канкурэнтныя і забяспечылі свабоднае волевыяўленне грамадзян Беларусі», — сказана ў дакуменце.

Саюзныя парламентарыі адзначылі, што за ходам выбарчай кампаніі назірала значная колькасць міжнародных назіральнікаў, у тым ліку ад Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі і Міжпарламенцкай Асамблеі СНД. Пры гэтым фактаў, якія ставілі б пад сумненне легітымнасць выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, не выяўлена.

Аўтары звароту заклікаюць ўсе краіны паважаць суверэнны выбар беларускага народа.

«Лічым, што штучнае нагнятанне сітуацыі вакол вынікаў галасавання супярэчыць літары і духу міжнароднага права. Заяўляем аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржавы і выступаем супраць любых спробаў дэстабілізацыі грамадска-палітычнай абстаноўкі ў Рэспубліцы Беларусь, — сказана далей у заяве. — Усе пытанні павінны вырашацца канструктыўна, у рамках дзеючага прававога поля. Упэўненыя, што беларускі народ у гэты адказны момант праявіць мудрасць, захавае мір і стабільнасць у імя працвітання сваёй Радзімы».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «Мы хочам мірна працаваць...»

**Працаўнікі аграрнага сектара краіны звярнуліся з заявай. Яна размешчана на сайце верхняй палаты беларускага парламента.**

У заяве гаворыцца, што аграрыі, якія займаюцца сваёй штодзённай карпатлівай работай, мірна працуюць, збіраюць ураджай, што паспеў, клапоцяцца аб тым, каб заўтра і ў перспектыве ў людзей быў хлебны каравай. Але адпаведным сілам, відаць, не даспадобы наша стваральная праца, выказваецца меркаванне ў дакуменце.

«Мы, беларускія сяляне, абураныя спробамі дэструктыўных сіл унесці ў грамадства смуту, дэстабілізаваць абстаноўку, увесці краіну ў хаос», — адзначаюць аўтары звароту.

Яны падтрымліваюць палітычны курс краіны, звяртаючы ўвагу на тое, што ўсё дасягнута выключна працай, а не мітынгамі і забастоўкамі. «Толькі на полі і ферме, каля станка і ў забоі, каля школьнай дошкі і за камп'ютарам, на сцэне тэатра ствараюцца матэрыяльныя і культурныя даброты для нашага чалавека», — падкрэслена ў звароце.

«Мы хочам вучыць і выхоўваць нашых дзяцей, бачыць іх шчаслівымі, спакойна няньчыць унукаў. Такія нашы намеры, і яны цалкам супадаюць з намерамі і дзеяннямі нашых уладаў, нашага Прэзідэнта. Мы не хочам узрушэнняў і супрацьстаянняў, мы хочам мірна працаваць і ўмацоўваць дабрабыт нашай Радзімы.

Мы супраць разбурэнняў, супраць дэстабілізацыі, супраць агрэсіі.

Мы, грамадзяне свабоднай, незалежнай міралюбнай краіны, не дазволім, каб наша Беларусь збочыла з вызначанага шляху!»

Падпісантамі дакумента выступаюць Беларуская аграрная партыя, Рэспубліканскі аграпрамысловы саюз і Беларускі сялянскі савет.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# Веды, культура і духоўнасць — гарантыя стабільнасці і росквіту дзяржавы

**Старшыні профільных камісій Савета Рэспублікі прынялі ўдзел у святочных лінейках, прымеркаваных да пачатку навучальнага года.**



Так, **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ** павіншаваў з Днём ведаў навучэнцаў адной з найстарэйшых школ Мінска — СШ № 4, якая налета адзначыць свой 115-гадовы юбілей. Цяпер тут навучаецца амаль тысяча школьнікаў. Парламентарый пажадаў ім поспехаў, важных дасягненняў і перамог, выказаў надзею, што школа падаруе свет ведаў, навучыць дабрыні і справядлівасці, а штодзённая карпатлівая праца настаўнікаў, іх высокі прафесіяналізм стануць асновай якаснай адукацыі, фундаментам прафесійнага росту, грамадзянскасці і патрыятызму.

— Веды, культура і духоўнасць — гарантыя стабільнасці і росквіту дзяржавы, — падкрэсліў старшыня профільнай камісіі ў сваім выступленні.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** павіншаваў з пачаткам новага навучальнага года вучняў сталічнай гімназіі № 17.



> Вельмі важна, каб школа не толькі передавала веды, але і фарміравала асобу разам з сям'ёй. Таму і вучань, і педагог, і бацькі — гэта адзінае цэлае, якое можа забяспечыць паспяховы педагагічны працэс.

— У нас у краіне вельмі моцная педагагічная школа. Гэта адзначаюць спецыялісты постсавецкай прасторы і нашы замежныя калегі, — падкрэсліў парламентарый. — Вельмі важна, каб школа не толькі перадавала веды, але і фарміравала асобу разам з сям'ёй. Таму і вучань, і педагог, і бацькі — гэта адзінае цэлае, якое можа забяспечыць паспяховы педагагічны працэс.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** прыняў удзел у святочнай лінейцы і першым уроку «Мая Радзіма — Рэспубліка Беларусь» у сярэдняй школе № 168 горада Мінска.

Парламентарый павіншаваў дзяцей і настаўнікаў з Днем ведаў, пажадаў здароўя, аптымізму, стабільнасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні, а таксама заклікаў вучняў прысвячаць свой вольны час спорту і карысным грамадскім справам. У школе Сяргей Сівец таксама азнаёміўся з арганізацыяй навучальнага працэсу і пагутарыў з педагогамі.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

# ХТО З ПРАБЛЕМАЙ, А ХТО І ПА ПАРАДУ...

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр КАРПІЦКІ даведаўся, што хвалюе жыхароў Камянецкага раёна Брэстчыны.**



Сенатар правёў тут прыём грамадзян і прамую лінію. Асноўная частка пытанняў датычылася аказання планавай медыцынскай дапамогі, бо парламентарый працуе галоўным урачом Брэсцкай абласной бальніцы і для мясцовых жыхароў гэта добрая магчымасць звярнуцца да яго па прафесійную дапамогу. Усім тым, хто звярнуўся, былі прызначаны даты кансультацый спецыялістаў і шпіталізацыі ў абласную клінічную бальніцу.

Арганізатары раённага свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі-2020» прапанавалі абмеркаваць праграму мерапрыемства. На думку парламентарыя, заўсёды радасна, калі прыёмы праходзяць у канструктыўнай атмасферы:

— Калі праблему, з якой звяртаюцца, атрымліваецца вырашыць на месцы, ці калі звяртаюцца не толькі з праблемамі, але і прыходзяць па мудрую і добрую параду, — падкрэсліў ён.

Пасля прыёму Аляксандр Карпіцкі абмеркаваў з кіраўніцтвам райвыканкама выкананне даручэнняў па зваротах грамадзян, якія знаходзяцца ў яго на кантролі. Гаворка ішла пра забеспячэнне адной са школ Камянецкага раёна санітарна-тэхнічным абсталяваннем і арганізацыі двухбаковага выезду з аўтастаянкі СШ № 2 райцэнтра.

У той жа дзень сенатар прыняў удзел у пасяджэнні райвыканкама, дзе былі разгледжаны пытанні рэалізацыі дзяржпраграм «Будаўніцтва жылля» і «Камфортнае жыллё і спрыяльны асяродак» на 2016—2020 гады. Аляксандр Карпіцкі адзначыў неабходнасць і надалей забяспечваць каардынацыю работы ўсіх структурных падраздзяленняў райвыканкама, прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў раёна па рэалізацыі праграм будаўніцтва жылля, забяспечыць аказанне паслуг у межах сацыяльнага заказу, пастаяннае інфармаванне грамадзян аб тым, што зроблена, праз мясцовыя сродкі масавай інфармацыі.

Таксама сенатар расказаў, як складваецца сітуацыя на Брэстчыне з распаўсюджваннем каранавіруснай інфекцыі і які прагноз надалей у рэгіёне.

На адной хвалі

# «СЮЖЭТ ДЛЯ ВЕЧНАСЦІ» З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

**Новы аўтарскі праект пісьменніка і публіцыста Навума ГАЛЬПЯРОВІЧА «Сюжэт для вечнасці» з'явіцца на канале «Культура» Беларускага радыё ў пачатку верасня і будзе гучаць у эфіры па нядзелях. Праграма будзе цікавай як аматарам літаратуры, так і шырокаму колу слухачоў, нераўнадушных да мастацкага слова.**



Навум Гальпяровіч пачынаў сваю кар'еру на Беларускім радыё ў якасці ўласнага карэспандэнта па Віцебскай вобласці, а зараз з'яўляецца намеснікам дырэктара радыёканала «Культура». Літаратурны дэбют Навума Якаўлевіча адбыўся ў наваполацкай газеце «Хімік». Сёння на рахунку мэтра — дзясяткі аўтарскіх радыёперадач, тэлевізійныя праекты і больш за дзесяць кніг, вершы з якіх перакладзеныя на польскую, румынскую, балгарскую, рускую, англійскую і іншыя мовы свету.

— У 2013 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла мая кніга пад назвай «Сюжэт для вечнасці», — расказвае Навум Гальпяровіч. — Але новы радыёпраект не пра кнігу, а пра тое, што хачу расказаць слухачам: чым я жыў і жыву, пра што мару, пра маё пакаленне, на якое прыйшлося і пасляваеннае дзяцінства, і савецкі час, і перабудова, і жыццё ў сённяшняй незалежнай Беларусі... Аб гэтым, а таксама пра сталенне чалавека, фарміраванне яго асобы і пойдзе размова ў праграме. Гэта вершы і проза, напісаныя ў розны час, але аб'яднаныя назвай — «Сюжэт для вечнасці».

Арыгінальны праект папоўніць цыкл літаратурных перадач на канале «Культура», сярод якіх «Паэзія XXI стагоддзя», «Літаратурная анталогія», «Радыёбібліятэка», «Паэтычная раніца» і іншыя. Першы выпуск аўтарскіх чытанняў пад музыку выйдзе ў эфір 6 верасня ў 09.05. Слухачы пачуюць апавяданні «Пітомнік» і «Мама».

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 102

Наступную задачу склаў Аляксандр Мышкавец з г. Ганцавічы ***(гл. дыяграму).***




Белыя: Kpd7, Ла3, Cb7, Ce5, Kb4, Kb6, пс4 (7).

Чорныя: Kpc5, Ca5, па7 (3).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Як мы ўжо паведамлялі, зборная Беларусі прыняла ўдзел у анлайн-алімпіядзе ФІДЭ. Наша каманда была ўключана ў другі па моцы дывізіён з пяці магчымых, дзе выступала ў групе А разам з яшчэ дзевяццю зборнымі. На жаль, вынік атрымаўся не вельмі ўдалы, таму беларуская каманда выбыла з далейшай барацьбы.

У першым туры нашы землякі саступілі Балгарыі (2,5:3,5), у другім перамаглі Бангладэш (4:2), у трэцім нечакана прайгралі Туркменістану (2,5:3,5). Няўдала склаўся і другі гульнявы дзень — паражэнні ад Філіпін (1,5:4,5), Інданезіі (2,5:3,5) і Германіі (2,5:3,5). У заключны дзень беларуская каманда атрымала тры перамогі: над Кіргізіяй (5,5:0,5), Бельгіяй (4,5:1,5) і Аўстраліяй (3,5:2,5), але ў выніку заняла толькі шостае месца з дзесяці магчымых, набраўшы восем матчавых балаў. Тры прызавыя месцы ў гэтай групе занялі Балгарыя (18 балаў), Германія (15) і Інданезія (12).

На мужчынскіх дошках Уладзіслаў Кавалёў набраў 3,5 бала з 6, Аляксей Аляксандраў — 2 з 5, запасныя Кірыл Ступак і Вячаслаў Зарубіцкі — адпаведна 2 з 3 і 0,5 з 4.

На жаночых дошках у Вольгі Бадэлькі — 2,5 з 7, у Настассі Зязюлькінай — 4,5 з 6, у запасных Ланіты Сцяцко і Яны Ільючык — адпаведна 1,5 з 2 і 2,5 з 3.

На юніёрскіх дошках Міхаіл Нікіценка набраў 4 з 5, Аляксандра Тарасенка — 2,5 з 6, запасныя Дзяніс Лазавік і Ксенія Зелянцова — адпаведна 1,5 з 4 і 2 з 3.

Вось некалькі пераможных партый нашых шахматыстаў.

Аляксей Аляксандраў — Азыл Абдыжапар. 1. d4 d5 2. c4 c6 3. Kc3 Kf6 4. e3 e6 5. Kf3 Kbd7 6. Cd3 dc 7. C:c4 b5 8. Ce2 a6 9. e4 b4 10. e5 bc 11. ef cb 12. fg C:g7 13. C:b2 0-0 14. 0-0 c5 15. Лb1 Лb8 16. Фc2 cd 17. C:d4 Л:b1 18. Л:b1 C:d4 19. K:d4 Фf6 20. Kc6 Kpg7 21. Ka7 Фd8 22. Лb3 e5 23. h3 Kf6 24. Лb8 Фd4 25. K:c8 Ke4 26. C:a6 Лd8 27. Ke7 Фd1+ 28. Ф:d1 Л:d1+ 29. Kph2 K:f2 30. Лb6 f6 31. Лb2 Ke4 32. Ce2 Лa1 33. Kf5+ Kpf7 34. Cd3 Kc5 35. Cb1 Ka4 36. Лb7+ Kpe6 37. Ke3 Kc3 38. C:h7 e4 39. Лb3 Ke2 40. C:e4 Л:a2 41. Лb6+ Kpe5 42. Лe6+ Kpd4 43. Kf5+ Kpc3 44. Л:f6 Kpd2 45. h4 Лa4 46. Cf3 Kc3 47. Kpg3, 1:0.

Вольга Бадэлька — Айжан Алымбай. 1. d4 d5 2. c4 c6 3. cd cd 4. Cg5 Cf5 5. Kc3 Kc6 6. e3 h6 7. Ch4 Kf6 8. C:f6 ef 9. Фb3 Kb4 10. Cb5+ Cd7 11. C:d7+ Ф:d7 12. a3 Kc6 13. Ф:d5 Ф:d5 14. K:d5 0-0-0 15. Kc3 f5 16. g3 g5 17. Kf3 Cg7 18. Лc1 Kpb8 19. h4 f6 20. Kpd2 g4 21. Ke1 h5 22. Kd3 Ch6 23. Kpc2 K:d4+ 24. ed C:c1 25. Л:c1 Л:d4 26. Лd1 Лhd8 27. Kf4 Л:d1 28. K:d1 Лc8+ 29. Kpd2 Лd8+ 30. Kpe2 Лe8+ 31. Ke3 Лh8 32. K:f5 Лh7 33. Ke3 Kpc8 34. Ked5 Лh6 35. Kpd3 Kpd7 36. Kpe4 Kpe8 37. K:h5 Kpf7 38. Kh:f6 Л:f6 39. K:f6 Kp:f6 40. Kpf4, 1:0.

Міхаіл Нікіценка — Лорэнт Хайнх. 1. e4 e5 2. Kf3 Kc6 3. Cb5 a6 4. Ca4 Kf6 5. 0-0 b5 6. Cb3 Ce7 7. Лe1 0-0 8. a4 Cb7 9. d3 d6 10. c3 Kb8 11. Kbd2 Kbd7 12. a5 c5 13. Kf1 c4 14. dc bc 15. C:c4 K:e4 16. Ke3 Kef6 17. Kf5 Лc8 18. Ca2 Kc5 19. Cg5 Kce4 20. Ch4 g6 21. K:e7+ Ф:e7 22. Kd2 K:d2 23. Ф:d2 Лfe8 24. f4 Лc7 25. Фf2 Kpg7 26. fe de 27. Лf1 Ke4 28. C:e7 K:f2 29. Cd6 Лd7 30. Л:f2 Л:d6 31. Л:f7+ Kph6 32. Л:b7 e4 33. Лe1 e3 34. Cc4 Лc8 35. b3 Лe8 36. Лb6 Лd2 37. C:a6 Лf8 38. Cf1, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. c5! Не вядзе да мэты 1. Cf4(g3, h2)? Cc7! Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук. Шэраг ранейшых задач рашыў таксама Уладзімір Панько.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Раніца пачынаецца... з «Дабраранку»!

**З пачатку восені маленькіх гледачоў «Дабраранку», які выходзіць на «Беларусь 3», чакае серыя незвычайных выпускаў любімай праграмы. Творчая група тэлеканала ў гульнявой форме прадставіць новых дзяцей-вядучых, якія будуць разам са знаёмымі зайчанятамі Касяй і Лесікам рабіць кожную раніцу тэлесезона 2020/21 сапраўды добрай!**



Фота Белтэлерадыёкампаніі.



Нагадаем, што ў 2017 годзе разам з лялечнымі персанажамі, якіх агучваюць акцёры Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Наталля Кот-Кузьма і Дзмітрый Чуйкоў, упершыню сувядучымі праекта «Дабраранак» сталі дзеці — і ранішняя праграма здабыла свой непаўторны шарм, стаўшы для маладшай аўдыторыі сацыякультурнага тэлеканала інтэрактыўнай пазнавальна-забаўляльнай зарадкай перад садком і школай. Але ж час не стаіць на месцы, дзеці растуць, і, каб не згубіць казачную атмасферу маленства, аўтары вырашылі ўвесці новае «пакаленне» вядучых — траіх хлопчыкаў і трох дзяўчынак. Пры гэтым творчая група праекта не развітваецца і з прадстаўнікамі мінулага, вопытнага «пакалення» — яны будуць з'яўляцца ў выпусках праграмы ў якасці экспертаў і ментараў.

На кастынгу, які праводзіўся ў жніўні, маленькія ўдзельнікі праслухоўвання прайшлі сур'ёзнае выпрабаванне імправізацыяй, паказалі высокі ўзровень валодання роднай мовай, і, як прызнаецца **шэф-рэдактар праграмы Алена ФУРСАВА,** амаль што кожны з кандыдатаў заслугоўваў месца ў «Дабраранку». Дарэчы, фрагменты пробных запісаў усіх прэтэндэнтаў на ролю вядучага тэматычна абыграюць і пакажуць у эфіры праграмы.

— Калі ў «Калыханцы» мы жадаем нашым дзеткам прыемнага, спакойнага адпачынку, то галоўная мэта праекта «Дабраранак» — зараджаць дашкольнікаў і школьнікаў бадзёрасцю і добрым настроем на ўвесь дзень, — распавядае Алена Фурсава. — У кожным выпуску, акрамя вясёлых забаўляльных нотак, ёсць яшчэ і пазнавальная частка, якая ўвасабляецца ў гульнявой форме. Мы распавядаем пра ўсё тое, што цікавіць дзетак, ілюструем гэта фотаздымкамі, відэаматэрыяламі і адкрыта звяртаемся да нашых гледачоў, бо яны — паўнавартасныя саўдзельнікі праграмы. Мы гэта разумеем па лістах і малюнках, якія атрымліваем, па водгуках на прапанаваныя хатнія заданні і віктарыны і таму ствараем у эфіры атмасферу добразычлівага дыялогу — нібыта і Кася з Лесікам, і вядучыя ў кадры таксама бачаць і чуюць кожнага з нашай юнай тэлеаўдыторыі.

Дарэчы, у бліжэйшы час дзякуючы партнёрству з дзіцячым часопісам «Умняша» творчых выпрабаванняў і прыемных падарункаў стане яшчэ больш! А калі жадаеце паўдзельнічаць у разнастайных рубрыках, конкурсах і апытанках праграмы «Дабраранак», то зрабіць гэта вельмі проста — рэдакцыя праекта падтрымлівае сувязь з гледачамі як па электроннай пошце dabraranaktv@gmail.com, так і праз лісты на адрас Белтэлерадыёкампаніі: 220114, г. Мінск, вул. Макаёнка, 9.

Праект «Дабраранак» упершыню з'явіўся ў эфіры 20 верасня 2013 года і вось ужо на працягу сямі гадоў выходзіць на тэлеканале «Беларусь 3» па буднях а 7-й гадзіне раніцы.

**Алена ДРАПКО.**


## «Восень са «Звяздой»



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 14 кастрычніка 2020 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск.

Сярод падпісчыкаў 16 кастрычніка 2020 года будуць разыграны 7 здрабняльнікаў-чопераў Galaxy GL і суперпрыз — сушка для агародніны і садавіны Redmand. Вынікі будуць апублікаваныя ў газеце «Звязда» да 25 кастрычніка 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 165 газеты «Звязда» ад 26 жніўня.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 01.09.2020 да 31.12.2020.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3840 ад 21.08.2020 года выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афармлена і аплачана ў** ____________________
*(аддзяленне сувязі)*

____________ **на IV квартал або II паўгоддзе 2020 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ________

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**

## Беларусь 1

**6.35, 16.40, 19.10 Меладрама «Занадта прыгожая жонка» (12+).**
**8.20** Клуб рэдактараў (16+).
**9.00. 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.50** Гісторыі збаўлення (12+).
**10.25** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**11.05** Вакол планеты.
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Меладрама «У цеснаце, ды не ў крыўдзе». 1-я і 2-я серыі (12+).**
**14.30** Маршрут пабудаваны (12+).
**15.15** Пакаленне.by (6+).
**15.35** Адзін дзень (12+).
**16.05** Лёс гігантаў.
**20.35** Навіны надвор'я.
**21.00** Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Домакіраўніца». 1—4-я серыі (12+).**

## Беларусь 2

**7.00 «Не нарадзіся прыгожай». Серыял (12+).**
**8.35** М/с «Стыч!» (6+).
**9.20, 19.45** Тэлебарометр.
**9.25** «Супержонка» (16+).
**10.15** «Да пабачэння» (16+).
**11.00** «Чалавек-невідзімка» (16+).
**11.55** «Пагоня за густам» (16+).
**12.40 Фантастыка «Зямля будучыні» (12+).**
**14.45** «Тата папаў» (16+).
**17.00** «Вежа» (12+).
**17.50 Драма «Баец» (16+).**
**20.15** «Арол і рэшка. Марскі сезон» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**21.15 Драма «Сотні вуліц» (16+).**
**22.50** «Трэці лішні» (16+) [СТ].
**23.45** «Муж напракат» (16+).

## Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 14.05, 20.20** Навіны культуры.
**8.20, 14.25** «Гэты дзень».
**8.25 «Па запалкі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Капусныя бліны і кіслая капуста з просам.
**10.55** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.50 «Дняпроўскі рубеж». Маст. фільм (16+) [СЦ].**
**14.30** «Камертон». Антон Заянчкоўскі.
**14.55** У. Кандрусевіч. «Соф'я Гальшанская». Спектакль Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра.
**16.45** «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
**17.00** Канцэрт «Славянскі базар у Віцебску — 2018».
**17.50 «Лёгкае жыццё». Маст. фільм (12+).**
**19.25** «Кадры жыцця». Алена Турава.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Джэк Васьмёркін — «амерыканец». Маст. фільм (12+).**

## Беларусь 5

**6.55** Азбука спорту.
**7.10, 20.25** Тэніс. WTA.
**9.15** Трэніровачны дзень.
**9.45, 19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі.
**11.50** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» — «Мінск».
**13.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. РЦАР-БДУ — «Слуцк».
**15.55** Вось гэта спорт!
**16.10** Піт-стоп.
**16.40, 19.15** Спорт-цэнтр.
**16.50** Хакей. КХЛ. «Спартак» — «Дынама-Мінск». (У перапынках Спорт-цэнтр.)
**22.30** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**23.15** Кіберспорт. Аўтаспорт. W-серыя.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16** (СЦ), 18.00 Нашы навіны.
**7.10** «Здароўе» (16+).
**8.10** «Жыццё іншых» (12+).
**9.10** «Нядзельная споведзь» [СЦ].
**9.25** «Метэагід».
**9.45 Маст. фільм «Нявеста майго сябра» (16+).**
**11.35** «Ці бачылі відэа?» (6+)
**12.50** «На дачу!» (6+)
**13.55** Да 90-годдзя Надзеі Румянцавай. «Адна з дзяўчат» (12+).
**14.35 Камедыя «Каралева бензакалонкі» (0+).**



**16.20, 23.40 Маст. фільм «Шукайце маму» (16+).**
**18.15** «Тры акорды» (16+).
**20.00** «Контуры».
**21.20** Музычны фестываль «Белыя ночы» (12+).
**23.20** «Спартклуб» (16+).

## СТБ

**6.35, 0.00** «Эліксір маладосці» (16+).
**8.20, 11.00, 20.50** Дак. спецпраект (16+).
**9.10** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**12.45, 13.40, 16.40 «Анатаміраванне пакажа». Серыял (16+).**
**19.30** «Тыдзень».
**22.30** «Засакрэчаныя спісы» (16+).

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Танчы, танчы» (12+).**
**6.15 Маст. фільм «Каханы раджа» [СЦ] (16+).**



**8.50** «Наша кіно. Заўсёды свежыя». Андрэй Пятроў. Арыгінал (12+).
**9.25** «ФазэндаЛайф» (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10, 16.15, 19.30 Серыял «Ціхая Варвара» [СЦ] (16+).**
**18.30, 0.00** Вынікова «Разам».
**20.30, 1.00 Серыял «Штрафнік» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Пакаранне без злачынства» (12+).**
**10.25** «Вуснамі немаўляці» (12+).
**11.00** Весткі.
**11.15 Маст. фільм «Ні за што не здамся» (12+).**
**14.30 Маст. фільм «Ты маё святло» (12+).**
**16.15 Маст. фільм «Два берагі надзеі» (12+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**21.25 Маст. фільм «У палоне падману» (12+).**
**23.00** «У людзях».
**23.30** Масква. Крэмль. Пуцін.
**0.10** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.25** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.55** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**7.25** «Хто ў доме гаспадар?» (12+)
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.15** «Іх норавы» (0+).
**8.35** «24 пытанні» (12+).
**9.05** «Беларусы» (6+).
**9.30** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.20** «Першая перадача» (16+).
**10.45** «Цуд тэхнікі» (12+).
**11.30** «Дачны адказ» (0+).
**12.20** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**13.15** «Паедзем, паядзім!» (0+)
**14.00** «Гісторыі збаўлення» (12+).
**14.25 Дэтэктыў «Танцы марыянетак» (16+).**
**16.15** «Дзіцячыя тавары» (16+).
**16.45** «Следства вялі...» (16+)
**18.05** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05** «Зоркі сышліся» (16+).
**21.20** «Ты не паверыш!» (16+)
**22.10** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).

## 8 канал

**7.00, 13.30, 16.20, 21.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** «Мультпарад».
**8.30, 16.15** «Прыколы 13-й школы» (6+).
**8.35** «Гатуй як шэф» (12+).
**9.00 Трылер «Моцны арэшак» (16+).**
**11.15 Трылер «Фарсаж» (12+).**
**13.35** «Глядзім усёй сям'ёй». М/ф.
**16.25 Дэтэктыў «Самурай».**
**18.10 Серыял «Касл» (12+).**
**18.55, 1.05** «Надвор'е».
**19.00 Камедыя «Гэта чортава сэрца» (16+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.15 Трылер «Шпіёнскія гульні» (16+).**
**23.20 Камедыя «Амерыканскі пярэварацень у Парыжы» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.20** «Лаві момант» (16+).
**8.35** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**9.20** Фантастыка «Дывергент, глава 3: за сцяной» (12+).
**11.25** Баявік «План уцёкаў» (16+).
**13.30** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**14.25.3.25** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**16.15** Камедыя «Наша Russia: яйкі Лёсу» (12+).
**17.50, 0.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**18.40** Серыял «#СеняФедзя» (16+).
**21.30** Серыял «Гатэль «Элеон» (16+).
**23.00** Серыял «Псіхалагіні» (16+).
**1.25** Серыял «Дзяўчынкі не здаюцца» (16+).
**2.15** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**5.00** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.40** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква акадэмічная.
**7.05** «Іншыя Раманавы». «Карона для ўнучкі» [СЦ].
**7.35** «Таямніцы зніклых гігантаў». Дак. фільм [СЦ].
**8.35** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**8.50, 16.30** «Пяшчота да равучага звера». Серыял. 1-я серыя.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.55** XX стагоддзе. «Шахцёры». Дак. фільм.
**12.10** «Сцяпан Макараў. Неспакойны адмірал». Дак. фільм.
**12.40** «Неапаль — душа барока». Дак. фільм.
**13.30** Лінія жыцця. Аляксей Сіманаў [СЦ].
**14.30** «Справа N. Міхаіл Сперанскі: рэфарматар на следстве». Дак. серыял [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. АРТ.
**15.20** Раман у камені.
**15.50** Востраў. Ізабэла Юр'ева.
**17.40, 1.55** Вядомыя фартэпіянныя канцэрты. І. Брамс. Канцэрт № 2 для фартэпіяна з аркестрам.
**18.30** Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
**19.45** Галоўная роля.
**20.05** «Правілы жыцця».
**20.30** «Дабранач, малыя!»
**20.50** 150 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Купрына. «Рубінавы бранзалет Купрына». Дак. фільм.
**21.35** «Сацы. Нясумная класіка ...»
**22.20** «Неапаль — душа барока». Дак. фільм.
**8.50, 16.30** «Цётка Маруся». Серыял. 1-я серыя.
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 0.50** ХХ стагоддзе. «Падарожжа па Маскве». Дак. фільмы.
**12.15** «Аляксандр Чыжэўскі. Ісціна простая». Дак. фільм.
**12.45, 22.10** «Забойства ў маёнтку Пемберлі». Серыял.
**13.45** 95 гадоў з дня нараджэння Барыса Чайкоўскага. «Ён жыў у музыкі ў палоне». Дак. фільм.
**14.30, 23.10** «Фотасфера». Дак. серыял [СЦ].
**15.05** Навіны. Падрабязна. Тэатр.
**15.20** Пернікавы домік. «Стражытныя рамёствы Дагестана» [СЦ].
**15.45** «2 Вернік 2».
**17.35, 2.00** Знакамітыя фартэпіянныя канцэрты. Л. Бетховен. Канцэрты № 2 і № 3 для фартэпіяна з аркестрам.
**18.35** Прыступкі цывілізацыі [СЦ].
**19.45** Галоўная роля.
**20.30** «Дабранач, малыя!»
**20.45** Больш, чым каханне. Леанід і Вікторыя Бранявыя [СЦ].
**21.25** «Энігма».

## Настальгія

**6.05** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «500 дзён, якія не ўзрушылі свет» (16+).
**7.10, 8.40, 9.45, 11.00, 14.30, 15.45, 17.00, 19.00, 21.45, 23.00, 1.05, 2.30, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.20** Маст. фільм «Мужчыны і ўсе астатнія» (16+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» (12+)
**13.15** Маст. фільм «Людзі і манекены» (12+).
**18.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага року» (18+).
**19.10** Маст. фільм «Пра цябе» (16+).
**20.30** «Ранішняя пошта».
**21.05** «Розныя думкі». 1986 год (12+).
**0.10** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Ісус Хрыстос — суперзорка» (18+).
**1.25** Маст. фільм «На прывязі каля ўзлётнай паласы» (16+).

## EuroSport 1

**0.00, 8.30, 11.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс» (12+).
**1.00, 11.30, 18.30** Тэніс. US Open (6+).

## Кінакамедыя

**1.10** Навагодні адрыў (16+).
**3.35** Пілец (18+).
**5.45** Найноўшы запавет (16+).
**7.55** Целаахоўнік кілера (18+).
**10.10** Гэта ўсё яна (16+).
**12.00** Калі б я была мужчынам (18+).



**13.55** Аднакласніцы: новы паварот (16+).
**15.15** Ілюзія падману-2 (12+).
**17.40** Карсіканец (16+).
**19.30** Да чорта на рогі (16+).
**21.10** Скандынаўскі фарсаж (16+).
**22.55** Плэйбой пад прыкрыццём (18+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.00** М/ф (6+).
**9.05, 23.35** «Улегцы» (12+).
**9.35, 17.40** «Скажы мне праўду» (16+).
**10.25, 15.40, 4.30** «Суд ідзе» (16+).
**11.20, 18.40** «Сляпая» (16+).
**12.25, 19.45** «Варажбітка» (12+).
**13.30, 3.15** «Містычныя гісторыі» (12+).
**14.30** «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
**16.40, 4.05** «Знакі лёсу» (16+).
**20.50** «Косці». Серыял (16+).
**22.40** «Начны адміністратар». Серыял (16+).
**0.05** «Знак якасці» (16+).
**0.50** «Адступнікі». Маст. фільм (16+).

## ТБ1000

**7.05** Парк Юрскага перыяду (16+).
**9.30** Парк Юрскага перыяду-2: закінуты свет (16+).
**11.45** Парк Юрскага перыяду-3 (16+).
**13.25** Солт (16+).



**15.10** Турыст (16+).
**17.00, 2.50** Раён № 9 (16+).
**19.00** Пасля нашай эры (16+).
**20.40** Кін (18+).
**22.30** Блізкія кантакты трэцяй ступені (6+).
**0.55** Чырвоная Шапка супраць зла (12+).
**5.00** Пасля нашай эры (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**8.00** Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).
**9.30** Нянька (16+).
**11.10** Географ глобус прапіў (16+).
**13.20** Жыццё і прыгоды Мішкі Японачыка (16+).
**15.15** Кома (16+).
**17.20** Глухар у кіно (16+).
**19.00** Метад Фрэйда (16+).
**20.55** Калектар (16+).
**22.10** Гумарыст (16+).
**0.00** Уцёкі (16+).
**2.05** Арытмія (18+).
**3.50** Тарас Бульба (16+).

## National Geographic

**6.00, 11.20, 15.45, 20.05** Фабрыка ежы.
**6.15** Панарама 360. Аб'ект сусветнай спадчыны.
**7.00, 13.10** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам.
**7.55** Золата Юкана.
**8.45** Мегазлом-4.
**9.40** Разумныя гарады свету: Бухарэст.
**10.30** Гісторыі збаўлення.
**12.10, 16.35** Драўляная скура.
**14.00, 18.25, 4.10** Аўта-SOS.
**14.50, 19.15, 1.50** Расследаванне авіякатастроф.
**21.00, 2.35** Ліхтугі за мяжой.
**21.50** Служба бяспекі аэрапорта: Бразілія і Перу.
**23.30** Служба бяспекі аэрапорта: Калумбія.
**0.20** Другая сусветная вайна: падводнае пекла.
**3.20** Асушыць акіян.
**4.55** Гульні розуму.

## Discovery

**8.00** Голыя, напалоханыя і самотныя (16+).
**8.45** Бітвы за кантэйнеры (12+).
**9.35, 22.18** Махінатары (12+).
**10.25, 17.12, 21.27, 5.19** Як гэта ўладкавана? (12+)
**11.15, 20.36, 5.42** Іржавая імперыя (12+).
**12.6, 19.45** Браты Дызель (16+).
**12.57** Што магло пайсці не так? (16+)
**13.48** Выбуховае шоу (16+).
**14.39** Мега-піт-стопы (12+).
**16.21** Махінатары: машына мары (12+).
**18.3** Каралі грузавікоў (12+).
**18.54** Ілюзіяніст (12+).
**23.9** Паляванне на каштоўныя камяні (12+).
**0.00** Залаты шлях Паркера Шнабэля (16+).
**0.51, 6.28** Голыя і напалоханыя (16+).
**1.42** Музейныя загадкі (12+).
**2.33** Аўтабан А2 (12+).
**3.24** Вялікі свет гульняў (12+).
**4.10** Геній аўтадызайну (12+).
**4.56** Як гэта ўладкавана: аўтамабілі мары (12+).

# НОВЫЯ ІЛЬГОТЫ — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**Пяць гадоў таму сем раёнаў Магілёўшчыны — Крычаўскі, Слаўгарадскі, Чэрыкаўскі, Клімавіцкі, Краснапольскі, Касцюковіцкі і Хоцімскі — атрымалі магчымасць карыстацца прэферэнцыямі і льготамі па Указе № 235. Сёлета падчас наведвання Касцюковіцкага раёна Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне падоўжыць тэрмін дзеяння гэтай праграмы яшчэ на пяць гадоў. Адпаведна быў прыняты Указ № 177 «Аб мерах па развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці», які прадугледжвае стварэнне дадатковых умоў для развіцця эканомікі і павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва.**
**У Магілёўскім аблвыканкаме ўжо распрацавана праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна з улікам новага ўказа. На днях Магілёўскі абласвет дэпутатаў яе зацвердзіў.**

— Ва ўказе закладзены прэферэнцыі, якія дадаліся да ўжо існуючых, — удакладняе **старшыня камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Дзмітрый МУДРАГЕЛАЎ.** — У папярэднім дакуменце для інвестара стваралася інфраструктура за кошт бюджэту, што было прынцыпова і важна. Гэта ўсё захавана, плюс дадалася льгота па кампенсацыі часткі выдаткаў за карыстанне крэдытамі Банка развіцця па тых праектах, якія рэалізуюцца на згаданай тэрыторыі. Гэта павінна прывабіць інвестара. Новым указам прадугледжаны льготы па арэндным жыллі, ёсць права яго выкупу па цане ў памеры 10 % ад ацэначнага кошту пры ўмове пражывання і ажыццяўлення працоўнай дзейнасці на гэтай тэрыторыі не менш чым 10 гадоў. Прадугледжана таксама закупка сельскагаспадарчай і будаўнічай тэхнікі — тое, што вельмі актуальна для прадпрыемстваў гэтага рэгіёна. У развіццё гэтага ўказа намі прынятая праграма, дзе ўсё распісана па ўсіх кірунках дзейнасці. Там агаворваецца, на якія параметры трэба выйсці раёнам, і пералічаны асноўныя мерапрыемствы ў рэальным сектары эканомікі і ў сацыяльнай сферы. На рэалізацыю мерапрыемстваў праграмы будзе накіравана з розных крыніц каля паўмільярда рублёў.

За перыяд дзеяння папярэдняй праграмы зроблена шмат. Пабудаваны дрэваапрацоўчыя цэхі ў Клімавіцкім, Касцюковіцкім, Краснапольскім, сушыльныя комплексы ў Краснапольскім і Чэрыкаўскім раёнах. Лясгасам закуплена неабходная тэхніка. У выніку аб'ём апрацоўкі драўніны павялічыўся ў 1,6 раза за кошт пасадкі маладых саджанцаў павялічыліся плошчы лясоў. Адкрылася некалькі сучасных вытворчасцяў. У Касцюковіцкім раёне запрацаваў ліцейны беларуска-расійскі завод і наладжана вытворчасць паліўных брыкетаў «Дрэвапіл». У Крычаўскім адкрыўся новы завод па вытворчасці цэментавастружкавых пліт і арганізавана вытворчасць па вырабе кукурузных палачак.



У Клімавіцкім раёне будуецца інавацыйнае прадпрыемства «Вуглеград».

З ліку найбольш значных праектаў, якія сёння рэалізуюцца на тэрыторыі паўднёва-ўсходняга рэгіёна, — стварэнне вытворчасці драўнянага вугалю кампаніяй «Вуглеград» у Клімавіцкім раёне. Інавацыйнае прадпрыемства будуюць у вёсцы Барсукі на месцы былога ваеннага аэрадрома.

> З пачатку дзеяння Указа № 235 у Слаўгарадскім раёне зарэгістраваны 34 суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і 103 індывідуальныя прадпрымальнікі. На 1 студзеня гэтага года іх было ўжо 53 і 142 адпаведна. Удзельная вага плацяжоў у бюджэт, выплачаных імі ў агульных паступленнях, склала 26,1 %.

— Праект «Вуглеград» вельмі перспектыўны, яго фінансуе прыватнае магілёўскае прадпрыемства «Тэхналіт» пад кіраўніцтвам кандыдата тэхнічных навук Аляксандра Бадзякі, — паведамляе **начальнік аддзела эканомікі Клімавіцкага райвыканкама Галіна ЗУБАРАВА.** — Створана ўжо 15 рабочых месцаў. Прадпрыемства стане вырабляць па новых тэхналогіях экалагічны вугаль, 90 працэнтаў якога будзе экспартавацца. Ужо набыты тэхніка, абсталяванне і імпартныя печы, якія ў будучым заснавальнік плануе вырабляць сам.

— Прадстаўнікоў прыватнага бізнесу прыцягвае тое, што дзяржава часткова бярэ на сябе затраты пры рэалізацыі інвестпраекта, — кажа Галіна Анатолеўна. — У прыватнасці, прэферэнцыямі 235-га ўказа па падаходным падатку і адлічэннях у Фонд сацыяльнай абароны ў нас скарысталіся два прыватныя прадпрыемствы.

У рамках рэалізацыі праграмы развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна выдзяляюцца сродкі на сацыяльную сферу. У 2021—2025 гадах у сямі раёнах плануецца абнавіць парк школьных аўтобусаў, рэканструяваць і правесці капітальны рамонт устаноў адукацыі і аховы здароўя.

У тых жа Клімавічах будзе абноўлена раённая бальніца. Прадугледжана развіццё жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва дадатковых станцый абезжалезвання. За кошт сродкаў Банка развіцця будзе знаменціравана лінія па грануляванні на Клімавіцкім камбінаце хлебапрадуктаў, з'явяцца дадатковыя аб'екты гандлю ў мясцовага райспажыўтаварыства. Летась дзякуючы сродкам Банка развіцця ім пабудавана сучасная крама плошчай звыш 50 квадратных метраў у вёсцы Барсукі. Налета райспажыўтаварыства плануе пабудаваць яшчэ дзве — у густанаселеным раёне па вуліцы Леніна і па вуліцы Чыгуначнай, дзе зусім стары гандлёвы аб'ект.

— Прапаноў шмат, — канстатуе Галіна Зубарава. — Мы накіравалі іх у вобласць для ўзгаднення, каб потым уключыць у план развіцця Клімавіцкага раёна на 2021—2025 гады. У нас, напрыклад, ёсць свінакомплекс, які ўжо даўно функцыянуе. Ён вычарпаў свой рэсурс, і мы сфармулявалі па пунктах, што трэба для павышэння эфектыўнасці яго работы. Зараз гэта таксама на разглядзе ў аблвыканкаме.

> «На рэалізацыю мерапрыемстваў праграмы будзе накіравана з розных крыніц каля паўмільярда рублёў.

Некалькі буйных праектаў пачалі рэалізоўвацца на тэрыторыі Слаўгарадскага раёна яшчэ ў рамках дзеяння 235-га ўказа. Магілёўскі мясакамбінат пабудаваў свінакомплекс у вёсцы Перагон праектнай магутнасцю 24 тысячы галоў у год. Хутка распачне дзейнасць прадпрыемства «Чырвоны харчавік — Слаўгарад».

— Гэтыя прадпрыемствы даюць нам перш за ўсё магчымасць развіваць сваю эканоміку і ствараць новыя рабочыя месцы, — звяртае ўвагу **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — На прадпрыемстве «Чырвоны харчавік — Слаўгарад» будзе ўстаноўлена новая высокатэхналагічная нямецкая лінія па вытворчасці мармеладу, што дазволіць работнікам атрымліваць высокую заработную плату.

Маленькія гарады вобласці пакутуюць з-за недахопу рабочых месцаў. Такія прадпрыемствы, як «Чырвоны харчавік — Слаўгарад» і свінакомплекс у вёсцы Перагон забяспечваюць занятасць насельніцтва, а значыць, папярэджваюць яго адток з раёна.

— Толькі на двух гэтых прадпрыемствах плануецца стварыць каля 200 рабочых месцаў, — кажа **намеснік старшыні Слаўгарадскага райвыканкама, які курыруе пытанні эканомікі, Руслан ІЛАРЫЁНАЎ.** — У планах «Чырвонага харчавіка» пасадзіць сад непадалёк, каб не было праблем з сыравінай. На прадпрыемстве таксама будзе запушчана лінія па расфасоўцы мёду. Дынамічна развіваецца малы бізнес. Сярод прыватных прадпрыемстваў, якія спецыялізуюцца на перапрацоўцы драўніны для паставак на ўнутраны і знешні рынкі, — ТАА «Кронатэкс-Бел», «СлаўЛесІнвест», «Слаўгарадскае лесанарыхтоўчае прадпрыемства», «ЭкаСветГандаль», «СлаўЛёнЭкспарт». У рабоце вельмі перспектыўны праект «Наватэль», які рэалізуюць расіяне. У будынку былога Дома быту яны ствараюць цэлы комплекс сферы паслуг — рэстаран, гасцініцу, цырульню і гэтак далей. Развіваецца і «сацыялка», у новым мікраёне Маладзёжны будуецца дзіцячы садок на 75 месцаў. Летась райспажыўтаварыства за кошт крэдытных сродкаў Банка развіцця пабудавала краму на вуліцы Маладзёжнай.

Да ведама, з пачатку дзеяння Указа № 235 у Слаўгарадскім раёне зарэгістраваны 34 суб'екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва і 103 індывідуальныя прадпрымальнікі. На 1 студзеня гэтага года іх было ўжо 53 і 142 адпаведна. Удзельная вага плацяжоў у бюджэт, выплачаных імі ў агульных паступленнях, склала 26,1 %.

У Чэрыкаўскім раёне праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна дала магчымасць адчувальна палепшыць вынікі ў аграрным комплексе.

— Гэта каласальная падтрымка для сельскай гаспадаркі, — упэўнены **старшыня Чэрыкаўскага райвыканкама Аляксандра МІХЕЕНКА.** — Сёлета дзякуючы падтрымцы, якую аказала дзяржава, мы выйшлі на дастаткова сур'ёзныя параметры. Вытворчасць малака склала да ўзроўню мінулага года 130 %, каля 170 % да леташняга ўзроўню будзе намалочана збожжа. Мы нарыхтавалі пад поўную патрэбу травяністых кармы. Усё гэта наглядна паказвае, якія вялікія сродкі ўкладаюцца ў развіццё раёна. І гэта менавіта дзякуючы праграме развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Нас падтрымалі з набыццём угнаенняў, тэхнікай. Практычна на 70 % абнавілі свой парк. Раёну перадалі сем новых камбайнаў. І мы імкнёмся, каб нашы паказчыкі былі не ніжэй за сярэднеабласны ўзровень. З такой падтрымкай гэта магчыма. Зараз, калі з'явіліся новыя прэферэнцыі, стане яшчэ лепш. Прадугледжана сур'ёзная падтрымка інвестпраектаў. На жаль, палітычныя перыпетыі, якія зараз адбываюцца, не даюць як след рэалізавацца гэтаму ўказу. Калі няма стабільнасці, інвестар не спяшаецца ўкладваць у краіну свае грошы. Спадзяёмся, што хутка ўсё стабілізуецца, і мы пачнём працаваць у звыклым рэжыме.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота аўтара, з архіва Слаўгарадскага райвыканкама і адкрытых крыніц.**

## Толькі лічбы

По даных камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама, за перыяд дзеяння 235-га ўказа з 1 ліпеня 2015 года ў эканоміку і сацыяльную сферу паўднёва-ўсходняга рэгіёна накіравана каля 945 мільёнаў рублёў інвестыцый у асноўны капітал. Прыцягнута больш чым 36,7 мільёна долараў прамых замежных інвестыцый. Створана 215 новых камерцыйных арганізацый, суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу, працаўладкавана 2310 чалавек. Узровень датацыйнасці знізіўся з 58,6 % у 2004 годзе да 55,9 % у 2019-м. Пабудавана 125,8 тысячы квадратных метраў жылля, у тым ліку 57,7 тысячы з дзяржпадтрымкай.



У вёсцы Перагон пабудаваны адзін з вялікіх свінагадоўчых комплексаў.

# І ЭЙФЕЛЕВА ВЕЖА Ў ДЗІВІНЕ

## Менш чым за паўгода былы райцэнтр кардынальна памяняў знешні выгляд

**Сярод былых райцэнтраў Брэстчыны Дзівін на поўдні Кобрынскага раёна выдзяляўся хіба сваёй некаторай патрыярхальнасцю. Мястэчка нібы спынілася ў часе. І хоць сюды, вядома, прыйшлі сучаснае транспартнае абслугоўванне, інтэрнэт і іншыя камунікацыі, знешні выгляд паселішча меў патрэбу ў абнаўленні. Таму «Дажынкі», можна сказаць, даўно прасіліся ў Дзівін. Падрыхтоўчая работа пачалася яшчэ летась, калі было прынята рашэнне і выдзелены сродкі на падрыхтоўку да правядзення абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі менавіта тут.**



### Пачыналі з грамадскай думкі

**Старшыня Дзівінскага сельскага Савета Вера ПІКУЛА** расказвае, як мясцовая ўлада працавала з насельніцтвам ад пачатку гэтага года:

— Была створана рабочая група з ліку дэпутатаў, старастаў, актывістаў. Пачынаючы з ранняй вясны мы наведвалі кожны падворак, гаварылі з людзьмі, тлумачылі, што будучае свята — гэта гонар для нашага населенага пункта, але і адказнасць яго жыхароў. Фарміравалі грамадскую думку наконт таго, што кожны падворак, кожны дом павінны быць прыбраныя, належыць прывесці ў парадак агароджу, зрабіць хоць бы касметычны рамонт. Праз некаторы час абходзілі ўсіх гаспадароў другі раз, тады размова была больш канкрэтнай. Напрыклад, указвалі, што трэба знесці сухое дрэва альбо пафарбаваць фасад. Вядома, сыходзілі з таго, хто можа гэта зрабіць і па фізічным, і па матэрыяльным становішчы. Калі ж чалавек састарэлы, інвалід, адзінокі, яго бралі на заметку, падворкі размяркоўвалі па арганізацыях, якія згодны былі аказаць дапамогу такім людзям. Таму да свята падыходзім з цалкам абноўленым прыватным сектарам. Людзі пастараліся, многае зрабілі на ўласных падворках — падсумоўвае кіраўнік мясцовай улады.

А вось чаго не хапае старажытнаму Дзівіну, дык гэта новай вытворчасці, прыватнай ініцыятывы, каб мястэчка ажыло, атрымала новы імпульс да развіцця. У тутэйшым дзіцячым садку каля сотні рэзервовых месцаў.

Старшыня сельсавета адзначае асаблівую дапамогу прадпрыемстваў і арганізацый Кобрына. З пачатку года на суботніках актыўна працавалі кабрынчане. Яны дапамагалі расчышчаць тэрыторыю, прыбіраць лішнюю расліннасць, асобныя арганізацыі знеслі трухлявыя дамы і правялі добраўпарадкаванне тэрыторый. Вядома, работу каардынаваў райвыканкам. Але жыхары Дзівіна сёння ўдзячныя працаўнікам арганізацый і ўстаноў горада за вялікую дапамогу. На суботнікі, вядома, выходзілі і дзівінцы — ад старшакласнікаў да актыўных пенсіянераў. Многае зрабілі талакой.

### Радыкальнае абнаўленне

Трэба сказаць, што калі я выйшла з маршруткі, мясцовасць проста не пазнала. У Дзівіне я бела апошні раз не так і даўно — з год таму. На гэты раз перад вачамі з'явіліся новыя парк і плошча. Тое, што цяпер можна з поўным правам назваць паркам з уладкаванымі дарожкамі, дзіцячай пляцоўкай, культурнымі дрэвамі, раней уяўляла сабой даволі занядбаную тэрыторыю. Штогод між вялікіх дрэў разрасталася дзікая акацыя, якую кожную вясну патроху высякалі, але агульнае адчуванне зарасніку і закінутасці тыя высяканні не перамагалі.

І вось цяпер невялікі цэнтральны парк радуе новымі сцежкамі, газонамі, лаўкамі. Важна, што акрамя парку ўладкавалі мясціну, якую ў народзе называюць «Дубкі», — тут абсталявалі сквер. Новую дзіцячую пляцоўку адразу ацанілі мамы з малымі. Стэнд-тумба на ўваходзе ў парк расказвае пра гісторыю старажытнага мястэчка. Наогул усе сацыяльныя аб'екты ў цэнтры непазнавальна змяніліся. Свежы выгляд набылі крамы, аптэка, кафэ з назвай «Мястэчка».

— І не кажыце мне, што форма не ўплывае на змест, — гаворыць наведвальніца ўстановы грамадскага харчавання Святлана Трубчык . — Раней у нашым кафэ толькі аматары выпіўкі доўга заседжваліся. А цяпер, калі памяняўся яго знешні выгляд, абнавіўся інтэр'ер, тут сталі гатаваць смачней, бо, відаць, сама абстаноўка ўплывае на якасць работы. Мы цяпер сюды на абед ходзім, стала прыемна, напрыклад, пасядзець за кавай. Аказваецца, і ў Дзівіне можа быць сучасная кропка грамадскага харчавання.

### Эксклюзіўныя клумбы і кампазіцыя «Вяселле»

Варта адзначыць яшчэ і зоны добраўпарадкавання. Спецыяльна да будучага фестывалю прымеркавалі конкурс прафесійнага майстэрства для работнікаў азелянення ЖКГ вобласці. Прадстаўнікі кожнага раёна рабілі сваю кампазіцыю. Удзельнікі прывезлі з сабой кветкі, падсыпку, каркасы, дэкаратыўныя матэрыялы — і стварылі ў некаторых выпадках амаль што творы мастацтва.

Напрыклад, маларыцкая альтанка адразу прывабіла маладыя парачкі і стала своеасаблівай фотазонай. Упрыгажэннем вуліцы, несумненна, стала вялікая зялёная чарапаха, якая «пасялілася» каля аптэкі. Яшчэ дзве, не падобныя адна на адну, чарапахі паявіліся ў іншых месцах. А вось пружанскія ўдзельнікі конкурсу пабудавалі кампазіцыю з міні-вежай, і не якой-небудзь, а Эйфелевай. Кобрынскія камунальнікі падарылі землякам вялікае чырвонае сэрца. Кожная з кампазіцый, вядома, заслугоўвае асобнай увагі і асобнага сэлфі, што несумненна, з'явяцца падчас свята.

Пакінулі свой падарунак аграгарадку і прафесіянальныя рэзчыкі па дрэве. Два месяцы таму каля возера Любань прайшоў абласны пленэр рэзчыкаў. Майстры зрабілі скульптуры герояў тутэйшага вяселля: маладую з маладым, маці з бацькам, свата са сваццяй ды гарманіста з бубначом. У драўлянай постаці сваццi без цяжкасці пазнаецца знакамітая лелікаўская сваццяз пёрамі. Кампазіцыю з васьмі фігур размясцілі на пляцоўцы побач з поштай. На гэтым тыдні тут ішла работа па добраўпарадкаванні — рабочыя рыхтавалі газоны з травой.

### Сацыяльны праект «Дажынкі»

Як вядома, «Дажынкі» ў нашай краіне трывала асацыююцца з сацыяльным праектам. Пад мерапрыемства выдзяляюцца сродкі на рамонт і абнаўленне шэрагу сацыяльных аб'ектаў. Вось і для Дзівіна грошы выдаткавалі абласны і раённы бюджэты.

**Наталля КАВАЛЕВІЧ, загадчыца дзіцячага садка**, з задавальненнем паказвае сваю абноўленую ўстанову:

— У двух групах праведзены капітальны рамонт, у астатніх — касметычны. Ва ўсім будынку заменена сантэхнічнае абсталяванне, у абодвух карпусах вокны пamenены на пластыкавыя. Праведзены рамонт цеплавузла, заменена вентыляцыя. Харчовы блок пасля капітальнага рамонту і замены абсталявання стаў непазнавальны. З'явілася новая мэбля. Адным словам, новы навучальны год пачынаем у камфортных умовах — на радасць бацькам, выхаванцам і супрацоўнікам. Днямі чакаем абсталяванне для спартыўнага гарадка, якое прывязуць шэфы, — Кобрынскі малочны завод.

Паводле слоў загадчыцы, садок складаецца з двух карпусоў. Адзін з іх быў узведзены ў 1972 годзе, другі — у 1986-м, у кожным з будынкаў назапасіліся свае праблемы, якія ўдалося вырашыць з дапамогай капіталаўкладанняў у рамках падрыхтоўкі да «Дажынак».

Новую якасць функцыянавання атрымала і мясцовая ўстанова аховы здароўя. **Загадчык бальніцы Аляксандр ДЗЕЙКА** кажа, што сёлета ў палатах і іншых памяшканнях бальніцы нарэшце надыдзе доўгачаканае цяпло. Кожны год з надыходам сезона пацыенты скардзіліся на холад. Вядома, ляжаць у настылай палаце не вельмі прыемна. І вось замена вокнаў, дзвярэй ва ўсім будынку, рэканструкцыя інжынерных камунікацый цеплатрасы, рамонт даху зрабілі сваю справу ў плане павышэння камфорту.

Акрамя таго, праведзены капітальны рамонт аддзялення сястрынскага догляду. Аляксандр Іосіфавіч паказвае палаты, працэдурны кабінет, харчовае памяшканне, санвузлы. Паводле слоў доктара, тут усё разабралі да цэглы — замянілі трубы вады і каналізацыі, праводку; новае абсталяванне атрымала раздатачная і памяшканні для гігіены. Будаўнікі ўжо сышлі адсюль, застаецца адмыць ды абставіць пакоі. Зараз у бальніцы працягваецца мантаж пад'ёміка для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

Адчула на сабе ўплыў «Дажынак» і сярэдняя школа. Ва ўстанове адукацыі праведзены рамонт спортзалы з уцяпленнем сцен. Зараз устанаўліваецца пляцоўка для варкаўта.




Фестываль неўзабаве адшуміць-адгуляе, а ўзведзенае і адрамантаванае застанецца. Заасфальтаваныя вуліцы Кастрычніцкая і Камсамольская, на іншых палепшана гравійна-пясчанае пакрыццё. Цэнтральныя вуліцы Савецкая і Леніна рэканструяваны, абноўлена сістэма асвятлення. На стадыі завяршэння рэканструкцыя вуліцы цэльнай. Тут пералічана далёка не ўсё, што можа сведчыць пра паляпшэнне якасці жыцця месцічаў. А вось чаго не хапае старажытнаму Дзівіну, дык гэта новай вытворчасці, прыватнай ініцыятывы, каб мястэчка ажыло, атрымала новы імпульс да развіцця. У тутэйшым дзіцячым садку каля сотні рэзервовых месцаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Кобрынскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праcп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 3 верасня 2020 года.

# ПАЎЗА, ЯКАЯ ЗАЦЯГНУЛАСЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Намеснік начальніка аддзела кансалтынгу і аналітыкі агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Андрэй ЧАРНЫШОЎ** таксама пацвярджае зніжэнне попыту на рынку нерухомасці ў жніўні. Паводле дадзеных сектара іпатэчнага крэдытавання гэтага агенцтва нерухомасці, сёння купіць у крэдыт гатовую кватэру можна толькі на першасным рынку, ды і то не ва ўсіх новабудоўлях, а толькі ў тых, што ўведзены ў эксплуатацыю, па якіх банкі прадастаўляюць «спецпраграмы» крэдытавання.

Тым пакупнікам, хто разглядае кватэры на другасным рынку, неабходна разлічваць толькі на ўласныя сродкі альбо разглядаць магчымасць набыцця ў лізінг на 10 гадоў пад 22,5 %.

## Кватэры ўжо таннеюць

Аналітычным цэнтрам Realt.by былі адзначаныя змены на рынку жылля Мінска. Па-першае, індэкс цэн другаснага рынку жылля за апошні тыдзень знізіўся на 0,1 % і склаў 1399 долараў за квадратны метр.

Кватэры ў новабудоўлях Мінска за апошні тыдзень патаннелі ў сярэднім на 0,3 % — да 1329 долараў за «квадрат». Разрыў паміж сярэднім узроўнем цэн першаснага і другаснага рынкаў складае 70 долараў, што стала максімумам за восем тыдняў.

Цэны на другасным рынку жылля знізіліся ўпершыню за апошнія сем тыдняў. Будучы пералом у цэнавай дынаміцы «маячыў» яшчэ з сярэдзіны месяца, калі пачала расці колькасць зніжак у аб'явах. Пасля поўнага згортвання крэдытавання другаснага рынку далейшае зніжэнне цэн выглядае найбольш верагодным сцэнарыем развіцця падзей.

Дынаміка аб'ёму прапановы застаецца станоўчай другі тыдзень запар. Колькасць выстаўленых на продаж аб'ектаў за апошнія сем дзён вырасла на 1,7 % — да амаль васьмі тысяч аб'ектаў. Найбольш адчувальным прырост быў у сегменце аднапакаёвых кватэр (+3,1 %). Сярод раёнаў сталіцы прапанова расце хутчэй за ўсё ў Ленінскім і Кастрычніцкім. Кватэры з трыма і чатырма пакоямі патаннелі на 0,5 %. Сярэдні ўзровень цэн на аднапакаёўкі і «двушкі» ўжо некалькі тыдняў застаецца нязменным.

У раёнах сталіцы цэнавая дынаміка была розная. Найбольш прыкметнае змяненне адзначана ў Кастрычніцкім, дзе кватэры патаннелі ў сярэднім на 0,9 %.

За тыдзень змяніліся і цэны ў абласных цэнтрах Беларусі. Самая дарагая нерухомасць цяпер у Брэсце — 820 долараў за квадратны метр (+0,3 %), Віцебск — $641 (-0,2 %), Гомель — $627 (+0,4 %), Гродна — $725 (-0,6 %), Магілёў — $646 (+0,2 %).

У буйных гарадах Мінскай вобласці сярэдні ўзровень цэн на кватэры адзначыўся на такіх лічбах: Барысаў — $615 за «квадрат» (-0,3 %), Салігорск — $869 (-0,1 %), Маладзечна — $749 (-0,8 %), Жодзіна — $727 (-1 %), Слуцк — $574 (+0,1 %).

## Да лепшых часоў

Перспектыў выхаду з існуючага крызісу пакуль мала.

Як адзначаюць эксперты, жыхары, якія назапасілі невялікія сумы грошай, былі гатовыя ўкласціся ў паляпшэнне жыллёвых умоў, ужо цяпер думаюць пра тое, каб адкласці вырашэнне пытання да лепшых часоў і прытрымаць сродкі. Дзмітрый Рытвінскі мяркуе, што найбольш верагодна чакаць зніжэння цэн і зніжэння актыўнасці на рынку. Зніжэнне актыўнасці мы ўжо ўбачым па выніках жніўня, а восенню гэтая тэндэнцыя працягнецца. Псіхалагічны клімат у грамадстве яшчэ можа пагоршыцца чаканнем другой хвалі COVID-19, яно будзе таксама адбівацца на паводзінах удзельнікаў рынку. Што мы можам яшчэ ўбачыць у найбліжэйшы час, дык гэта рост колькасці прапаноў аб'ектаў нерухомасці да продажу і арэнды.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У ВЫХАДНЫЯ, БЫВАЕ, ЧАРГА СТАЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сказала, што дзеці на юбілей падарылі планшэт, запампавалі туды некалькі соцень цікавых твораў. «Так што буду чытаць без праблем», — заключыла наведвальніца. Але не прайшоў і месяц, як яна з'явілася на парозе: «Не, Сяргееўна, не хачу я чытаць кнігу на экране, не закрыеш на патрэбнай старонцы, закладку не зробіш, ды і не пахне кнігай гэты раўнадушны экран. Адкрывай мой фармуляр і запісвай».

Дарэчы, бібліятэка, дзе працуе Наталля Паўлюковіч і якой загадвае Алена Антончык, па выніках мінулага года прызнаная найлепшай у раёне.

— Мы багатыя сваімі чытачамі, — расказваюць жанчыны. — Уяўляеце, 83-гадовая Ніна Міхайлаўна Жалнярчук кожны тыдзень бярэ новыя творы, чытае класіку, творы ваеннай тэматыкі, дэтэктывы. Ёй цяжка паднімацца на другі паверх, дадому літаратуру носім. Часам пасля выхадных наша Ніна Міхайлаўна кажа, што дачакацца нас не магла. На тры гады маладзейшая за яе Надзея Вакульчык з Лінова любіць беларускую літаратуру. Усе навінкі на роднай мове першай прачытае Надзея Генадзеўна. Прыемна, што многія чытаюць сем'ямі.

А гэтым летам, адзначаюць бібліятэкары, было заўважана прыкметна больш дзяцей: ішлі і свае, і тыя, каго прывезлі на канікулы да бабуль. Пытаем у бацькоў, як заахвоцілі малых чытаць, а тыя кажуць: тэлефоны забралі. Вось які, аказваецца, просты рэцэпт.

## НАЙЛЕПШАЯ Ў РАЁНЕ

Яшчэ Ліноўская бібліятэка адметная сваімі мерапрыемствамі, на якія збіраюцца людзі сталага ўзросту. «Мы заўважылі, што апошнія гады карыстаецца попытам духоўная літаратура, — працягвае Алена Антончык. — І вырашылі разам з Аранчыцкай царквой наладзіць праграму «Запаліць святло душы». На сустрэчы прыходзілі ўдзельнікі царкоўнага хору. Гутарка са святаром, царкоўныя песнапенні, тэматычная праграма на падставе літаратуры, абмен меркаваннямі, думкамі — усё гэта аказалася тым, што трэба людзям. Вядома, большасць аўдыторыі складаюць пенсіянеры, але часам прыводзяць з сабой і маладзейшых членаў сям'і.

Праводзяць у Лінове мерапрыемствы і для школьнікаў, моладзі на тэмы краязнаўства, экалогіі, гавораць пра малую радзіму. «Але ж галоўнае — прасоўваць і папулярызаваць кнігу», — кажа бібліятэкар з вялікім стажам Наталля Паўлюковіч.



**Падчас ушанавання актыўных чытачоў Дзівінскай бібліятэкі.**

Наталля Сяргееўна ў свой час скончыла Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум і больш за 30 гадоў працуе тут. Сама шмат чытае, усе кніжныя навінкі разам з загадчыцай прачытваюць самі, каб з веданнем справы параіць чытачу.

Алена Антончык раней працавала ў аграрнай галіне, але ўжо 10 гадоў, як прыйшла ў бібліятэку. Яно і не дзіва, некалі студэнткай сельгасакадэміі стаяла ў чарзе па кнігу, дзяцей сваіх з ранніх гадоў прывучыла да чытання. І вось дачка Кацярына вучыцца ва ўніверсітэце, асвойвае бібліятэчную справу.

> **«Не хачу я чытаць кнігу на экране, не закрыеш на патрэбнай старонцы, закладку не зробіш, ды і не пахне кнігай гэты раўнадушны экран».**

Чаму гэтую бібліятэку вызначылі як найлепшую ў раёне? У іх лічбы-паказчыкі на першым месцы. План па прыцягненні юных чытачоў выкананы на 108 працэнтаў, ды і колькасць наведвальнікаў-пенсіянераў расце. Фонд зараз складае больш за 21 тысячу друкаваных выданняў. Працуе пункт кнігавыдачы ў Аранчыцах. Там раней была асобная бібліятэка. Яе закрылі, а кніжны фонд застаўся, вось і прыходзіць бібліятэкар раз на тыдзень у вызначаны час, каб людзям было больш зручна. Ну а літаратуру не толькі з былой бібліятэкі, але па заяўках прыносіць з Лінова.

— Людзі прыходзяць у бібліятэку не толькі па кнігу, але і дзеля добрага слова, навін. Тут ёсць магчымасць пагаварыць, абмяняцца думкамі, сустрэць знаёмага, пагартаць свежыя газеты, — разважае Алена Антончык.

## МЕСЦА СУСТРЭЧЫ ТВОРЧЫХ ЛЮДЗЕЙ

У Дзівіне Кобрынскага раёна бібліятэка размешчана ў цэнтры вёскі, у Доме культуры. У актыве пазначана 750 чытачоў. Загадчыца Людміла Свідуновіч гаворыць, што кожны месяц у чытальнай зале ладзіцца нейкае мерапрыемства. Тут здаўна прывячаюць творчых людзей, якімі багаты Дзівін. На вечарынах выступаюць мясцовыя паэты і пісьменнікі. Такія, напрыклад, як Надзея Момлік, Надзея Самасюк, Ірына Жук. Народны майстар Юлія Піваварава дае майстар-класы па саломапляценні, фотамастацтве, чытае свае творы. А вясковыя пенсіянеры з задавальненнем ходзяць на вечарысустрэчы, якія бібліятэкары ладзяць разам з цэнтрам тэрытарыяльнага абслугоўвання насельніцтва, тады запрашаюць псіхолага, урача, іншых спецыялістаў.

— Але ж галоўная наша работа — стасункі з чытачом і кнігай, — расказвае Людміла Андрэеўна. — У выхадныя, бывае, чарга стаць ля афармленне фармуляраў. Да нас ідуць людзі самых розных узростаў: ад школьнікаў да пенсіянераў. Дзеці чытаюць па школьнай праграме. У старэйшых наведвальнікаў попытам карыстаюцца жаночы раман, прыгодніцкая літаратура, дэтэктывы. Прыемна, што многія чытачы апошнім часам звяртаюцца да класікі. Гэта знак таго, што бібліятэка будзе і ў далейшым запатрабаваная.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Пружанскі, Кобрынскі раёны.*

# МІЛЕЙ ЗА ЧУЖЫЯ КЛЯМКІ...

**Амаль што незаўважанай шырокай грамадскасцю аказалася падзея, якая стасуецца і з музейным жыццём, і з медыйнымі працэсамі. У нашай краіне пачаў выдавацца навукова-папулярны часопіс «Беларускі музей».**

Ужо пабачыў свет другі нумар выдання, якое пакуль што прыходзіць да чытача штоквартальна. Заснавальнік часопіса — Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Галоўны рэдактар — Павел САПОЦЬКА. У склад навукова-рэдакцыйнай рады ўваходзяць дасведчаныя музейшчыкі, арганізатары музейнай справы — Н. Задзяркоўская, М. Бяспалая, Ю. Кітурка, А. Ляшковіч, М. Рыбакоў, У. Пракапцоў.




**Вокладка новага часопіса.**

У другім нумары чытача чакаюць сустрэчы з заслужаным дзеячам культуры Рэспублікі Беларусь, кіраўніком Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі Зінаідай Кучар («На службе культуры і Беларусі»), прафесарам Аляксандрам Гужалоўскім («Асэнсаваць феномен на тэарэтыка-філасофскім узроўні»), які разглядае музейную справу на старонках айчынных дысертацыйных даследаванняў, даследчыцай Надзеяй Саўчанкай («Вярнуць забытае імя фатографа: праект «Сава Сіўко (1888—1978). Фатограф Любчанскага краю»), вядучым метадыстам Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Тацянай Ушылавай, якая разглядае гісторыю музея-сядзібы Францішка Багушэвіча «Кушляны» («Калок мілейшы, як чужыя клямкі...»), з музейшчыкам Ігарам Івановым («Гарадская плошча Стоўбцаў — запыленая кніга на незнаёмай мове»), які разважае пра актуалізацыю гістарычнага цэнтра горада, з жывапісцам і графікам Аляксандрам Салаўёвым («Я прызнаю ў мастацтве толькі споведзь...»), калекцыя работ якога захоўваецца ў зборах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка...

«Беларускі музей» — сапраўдная з'ява. І ў айчыннай музейнай справе. І ўвогуле ў сучаснай беларускай нацыянальнай культуры. І ў медыйнай справе. Нацыянальны гістарычны музей, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь зрабілі выразны крок да сур'ёзнай кансалідацыі навуковага, глыбокага практычнага досведу айчынных музейшчыкаў. Такога характару выданняў раней у нас не ставала. «Беларускі музей», відавочна, прадаўжае традыцыі, якія ў розныя дзесяцігоддзі запачаткоўвалі «Наш край», «Спадчына» («Помнікі гісторыі і культуры Беларусі»), «Беларуская мінуўшчына», «Беларускі гістарычны часопіс»...

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# «ПАЙДУ «БАРЫНЮ» СКАКАЦЬ»



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **1.** «Рыба з радасці такой // Пайшла ў скокі талакой, // А за ёю ... , наварыўшы кашкі». З вершаванай казкі Я. Коласа «Рак-вусач». **5.** Хто людзей весяліць, за таго ўвесь ... стаіць *(прык.)*. **7.** «Пайду барыню скакаць, // Надзену ... . // Буду ножкі падымаць // Вышэй табурэткі»; прыпеўка да імправізаванага танца «Барыня». **8.** «... , мае грачанікі, // ... мае ячныя»; прыпеўка да танца «Грачанікі», які танцавалі на Магілёўшчыне, на вяселлі. **9.** «Дзед боб малаціў, // ... падсявала, // Дзеткам раздавала»; прыпеўка да танца «Боб малаціць», які быў распаўсюджаны на Віцебшчыне. **12.** ... — радасць, танец — шчасце *(прык.)*. **15.** Тое, што і пуня. **16.** Герой беларускіх казак, волат. **17.** «А ну, ... , — тра-ля-ля! // Патанцуем, сват Грымька, // Каб аж бухала зямля!». З паэмы Я. Коласа « Сымон-музыка». **18.** «Саўка ды ... ладзілі дуду — // Павесяліцца, ды прагнаць нуду». З беларускай народнай песні «Саўка ды ... ». **20.** «Сербіяначку» скакаць, // Трэба многа песень знаць. // А як знаеш штук пяток, // Так садзіся ў ... »; прыпеўка да хуткага танца «Сербіянка». **22.** Назва танца, аднаго з варыянтаў беларускай полькі; «А ты, ..., не глядзі, // Што кажух падраўся. // То я з Тэкляю сваёй // Ўсю ноч мілаваўся». Прыпеўка. **24.** Каб не скрыпка і не ... , дык музыка свіней бы пас *(прык.)*. **26.** «Пад дуду і пад ... // Топне, прысплвае. // Сцеражыцеся ўсе людзі: // Беларус гуляе!» З верша Я. Купалы «Ігнату Буйніцкаму». **27.** «... ўсмешка — паўпацалунка». К. Макушынскі. **28.** «Узяўшы хустачку, ... , пайшла «Мяцеліцу» скакаць». З паэмы «Тарас на Парнасе».

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** «Паміж Польшай і Расіяй // ... беларуская». З песні «... беларуская» (словы Л. Дранько-Майсюка, музыка І. Лучанка). **2.** Танцавальны ... ; тое, што і па. **3.** «А во і сам Юпітэр з Вестай, — // Пусціўся, стары хрэн, у ... , // Як бы жаніх перад нявестай». З паэмы «Тарас на Парнасе». **4.** Закончаная частка спектакля. **6.** Рускі народны танец з моцным прытупваннем. **10.** Танец, у якім трое ўдзельнікаў становяцца тварам у круг і круцяцца, падскокваючы; танец быў распаўсюджаны на Палессі. **11.** «Бобік Жучку ўзяў пад ручку, // Сталі Польку танцаваць. // А ... — сіні носік — // Стаў на дудачцы іграць». З жартоўнай «Сабачай полькі». **13.** Танец, роднасны ўкраінскаму, які выконваюць з прысядкамі, прыпеўкамі; іншая назва — «Гапачок». **14.** Парны бальны танец; «... — гэта настальгія, мінулае». А. Пасенка. **17.** Частка бота. **19.** Бацькі елі журавіны, а ў дзяцей ... *(прык.)*. **21.** Сэрца весяліцца — і ... цвіце *(прык.)*. **23.** «Весь так пляшуць, прыпяваюць, // Хохат, лопат, крык і ... » З паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча «Гапон». **25.** «З усіх радасцяў на зямлі найлепшымі я лічу тры: каханне, ... і танцы». Гамер.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Птушкі. 5. Свет. 7. Балеткі. 8. Гоп. 9. Баба. 12. Песня. 15. Адрына. 16. Асілак. 17. Хлопча. 18. Грышка. 20. Куток. 22. Янка. 24. Бас. 26. Цымбалы. 27. Адна. 28. Венера.

**Па вертыкалі:** 1. Полька. 2. Шаг. 3. Пляс. 4. Акт. 6. Трапак. 10. Аколушка. 11. Барбосік. 13. Гапак. 14. Танга. 17. Халява. 19. Аскома. 21. Твар. 23. Зык. 25. Сон.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.23 | 19.52 | 13.29 |
| Віцебск — | 6.11 | 19.44 | 13.33 |
| Магілёў — | 6.14 | 19.42 | 13.28 |
| Гомель — | 6.13 | 19.37 | 13.24 |
| Гродна — | 6.39 | 20.07 | 13.28 |
| Брэст — | 6.42 | 20.05 | 13.23 |

### Месяц

*Поўня 2 верасня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

**Пр.** *Аляксея, Апанаса, Васіля, Гаўрылы, Івана, Макара, Міхаіла, Фёдара.* **К.** *Ліліяны, Разаліі, Ружы, Майсея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 4 ВЕРАСНЯ




**1776** год — выйшаў указ Кацярыны II аб стварэнні Полацкай губерні — адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Расійскай імперыі.

**1859** год — нарадзіўся Браніслаў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла, беларускі выдавец, мовазнаўца, кандыдат гісторыка-філалагічных навук, сапраўдны член Інбелкульта (1924). З 1925-га — рэдактар, у 1927—1929 гадах — старшыня камісіі Інбелкульта па складанні слоўніка беларускай мовы. Збіраў матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклору Беларусі. Ініцыятар стварэння, адзін з кіраўнікоў беларускага легальнага выдавецкага таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца» (1906—1914), студэнцкага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка (1912—1017), Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны (1916). Укладальнік рукапіснай «Беларускай хрэстаматыі», у якой сабраны асобныя творы Дуніна-Марцінкевіча, Лучыны, Сыракомлі, Цёткі і інш. Садзейнічаў творчаму станаўленню Янкі Купалы, быў рэдактарам яго першага зборніка «Жалейка», захаваў неапублікаваныя творы пецярбургскага перыяду (цяпер яны знаходзяцца ў Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску).



**1925** год — нарадзіўся Павел Сцяпанавіч Куц, беларускі вучоны ў галіне прамысловай цеплаэнергетыкі, доктар тэхнічных навук, прафесар, заслужаны вынаходнік Беларусі (2004).

**1965** год — нарадзілася Святлана Уладзіміраўна Бурага, беларуская спартсменка (лёгкая атлетыка, сямібор'е), майстар спорту СССР міжнароднага класа (1987). Удзельніца XXIV Алімпійскіх гульняў (1988), бронзавы прызёр чэмпіянату свету (1993), чэмпіёнка СССР (1987, 1988). Уладальніца Кубка Еўропы (1987, 1993, 1995), Кубка Беларусі (1997).




**1260** год — у бітве пры Монтэ-Аперта сышліся фларэнтыйскія гвельфы і сіенскія гібеліны. Гэта былі прадстаўнікі двух палітычных плыняў у Італіі і Германіі. Гвельфы арыентаваліся на Папу Рымскага, а гібеліны — на імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі. Перамогу ў бітве атрымалі гібеліны, якія выгналі з Фларэнцыі гвельфаў.

**1975** год — выйшла ў эфір першая перадача тэлевізійнага клуба «Што? Дзе? Калі?». Яе першым тэлевядучым быў Аляксандр Маслякоў. Уладзімір Варашылаў, які шмат гадоў вёў гульню пасля яго, з першага ж выпуску перадачы працаваў у ёй пазаштатным рэжысёрам.

**1976** год — першае з'яўленне ў эфіры перадачы «У гасцях у казкі» з вядучай Валянцінай Лявонцьевай.

**1987** год — указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР мастацкаму кіраўніку, салістцы Дзяржаўнага акадэмічнага рускага народнага ансамбля «Расія» Людміле Зыкінай прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У гэты ж дзень у Маскве завяршыўся суд над Матыясам Рустам. Нямецкі пілот — парушальнік мяжы — быў асуджаны да чатырох гадоў працоўных работ. Налета яго вызвалілі.




**НІЛ ГІЛЕВІЧ:**
*«Усіх нас прывучылі за паёк
Не там, дзе трэба, бачыць вінаватых».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Гэта будзе цяжкая ноч, не ўсе дажывуць да світання.**

**— Мікіта, зачыні халадзільнік, гэтыя катлеты на заўтра.**

Сустракаюцца дзве сяброўкі:

— Любачка, ты ж такі добра паправілася!

— Гэта я яшчэ схуднела! Бачыла б ты мяне месяц назад! Я была такой, як ты зараз!

Аснова дабрабыту доктара Ліпкіна грунтуецца на тонкім уменні ўтрымліваць хворага на хісткай грані паміж смерцю і выздараўленнем.




**— Ніна Валянцінаўна, як усё ж такі пахудзець?**

**— Ах, Ганначка, я вось ужо некалькі разоў садзілася на дыету!**

**— І што?**

**— Увесь час міма!**


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 317 17 16.



прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2838.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 верасня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12